незалежная газета

№ 1 (599) 8 студзеня 2009 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Заснаваная ў лістападзе 1906. Аднoўленая ў траўні 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у чацьвяргі



**Хто купіў і хто прадаў $417 млн па старым курсе перад самым абвалам?**

Старонка 8



**Дом Ломаця ў Ракаве**

Старонка 8

**Працоўная дынастыя Макеяў**

Старонка 9

# Ці будзе яшчэ адна дэвальвацыя?

Яна не выключаная, залежыць ад дынамікі крызісу. Прагнозы і каментары, парады эканамістаў — **старонкі 3—5**.



PHOTO.BYMEDIA.NET

**Успомнілі маладосць. Застрашаныя дэвальвацыяй, людзі размяталі айчынныя і імпартныя тавары.**

## У НУМАРЫ

**Падзенне золатавалютных запасаў паскорылася**

Нягледзячы на маніпуляцыі апошніх дзён 2008 году, яны скараціліся за снежань на рэкордныя $582,6 млн (15,4%). **Старонка 3.**

**Групавое самагубства на пагранзаставе**

Два салдаты павесіліся ў пушчы. **Старонка 9.**

**Раманчук і Вардамацкі спатрэбіліся ўраду**

Упершыню ў міжведамасную працоўную групу трапілі два апазіцыйныя інтэлектуалы. **Старонка 6.**

**Правакацыйныя эксперыменты**

Ці не пара спыніць практыку аператыўных эксперыментаў, у выніку якіх людзі трапляюць у турму на дзесяць гадоў? **Старонка 4.**

**Курасоўшчына — тэрыторыя, свабодная ад п’янства**

Ініцыятыва жыхароў Мінска. **Старонка 13.**

**Чыстыя штаны**

Першаіерарх Аўтакефальнай праваслаўнай царквы ў Польшчы быў агентам камуністычнай спецслужбы. Сумны вобраз царквы, цалкам падкантрольнай спецслужбам. **Старонка 9.**

**«Троіца», Паплаўская і Ціхановіч, Дразды**

Дыскаграфія ад Сяргея Будкіна. **Старонка 12.**

**Альгерд Бахарэвіч**

«Сарока на шыбеніцы» — гэта падарожжа па целе адной маладой жанчыны. **Старонка 11.**

### «Сапраўдны крызіс да нас прыйдзе вясной»

З нашага рэгіёну Украіна найлягчэй павінна выйсці з крызісу, для Расіі ж яго вынікі могуць быць катастрафічнымі. Беларусь недзе пасярэдзіны, мяркуе эканаміст Павал Данейка. **Старонка 4.**

### «НН» і «ARCHE» ў Гродне

**16 студзеня (пятніца) а 18.30 ў Гродне (вул. Будзённага 48 а, зала 100 (былая майстэрня Іваноўскага)** абудзецца ўрачыстае ўручэнне штогадовай прэміі часопісу «ARCHE» «За сумленнае слова» гарадзенскаму журналісту Андрэю Пачобуту. Падчас імпрэзы можна будзе азнаёміцца з «ваенным» і «ВКЛаўскім» нумарамі «ARCHE», кнігамі Адама Станкевіча і Паўла Севярынца і другой папулярнай літаратурай на беларускай мове. Запрашаюцца ўсе ахвочыя.

## А мы папярэджвалі

Ніводная дзяржаўная газета ані тэлеканал да 1 студзеня ні словам не згадалі пра магчымасць 20-працэнтавай дэвальвацыі рубля. Рашэнне ўладаў стала шокам для мільёнаў людзей. Яны ўмомант успомнілі маладосць і кінуліся ў крамы скупляць першае лепшае. А вось хто нават у часы забароны на распаўсюд праз «Саюздрукі» чытаў свабодную прэсу, тыя былі папярэджаныя: дэвальвацыя наспявае, яна можа здарыцца.

Таму падпішыцеся самі на незалежную газету і падкажыце сваім, каб і яны куплялі.

Як падпісацца — **старонка 2**.

Увага! Пачынаючы ад наступнага нумару газета будзе выходзіць у сераду і з’яўляцца ў кіёсках ва ўсёй краіне ў серады ад ранку.

# Кнігарня «Наша Ніва»: новыя выданні

«Наша Ніва» — гэта не толькі газета і сайт nn.by. Вакол газеты гуртуецца незалежная інтэлігенцыя. Нашаніўскае кола займаецца навуковымі даследаваннямі. Выдаюцца кнігі і дыскі.













У першыя дні новага году пабачылі свет чатыры новыя выданні з серыі «Кнігарня «Наша Ніва». Гэта шыкоўная кніга пластылінавых ляпілак для дзяцей «Пластыландыя». Гэта кніга Алеся Белага «Наша страва», прысвечаная сапраўднай беларускай кухні. Гэта кніга польскага журналіста Рышарда Капусцінскага «Імперыя», якая апісвае, як гніў і раскладаўся СССР. Капусцінскі — наш зямляк, родам з Пінску, кніга перакладзеная на беларускую мову. Гэта таксама дэбютная кніга сакавітай прозы Паўла Касцюкевіча.

Пытайцеся ў кнігарнях, а калі якія крамы баяцца прадаваць «Нашу Ніву», шукайце ў незалежных распаўсюднікаў, на рынках і беларускіх дамах.

## Падпісацца можна праз Рэдакцыю і праз «Белпошту». Мы рэкамендуем — праз Рэдакцыю

Мы рэкамендуем і просім чытачоў падпісвацца праз Рэдакцыю. Наша сістэма дастаўкі газеты за 3 гады даказала сваю надзейнасць. Усе тыя, каго такі спосаб атрымання газеты задавальняе, хай застаюцца вернымі такой падпісцы.

1. Яна нам выгаднейшая фінансава.

2. Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

3. Лічым важным захаваць сістэму самараспаўсюду дзейнай. Лішне тлумачыць, чаму.

Цана падпіскі праз Рэдакцыю **10 000 руб. на месяц**.

Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»: для людзей — **63125**, для прадпрыемстваў — **631252**. Падпісацца можна на кожнай пошце. Цана гэтай падпіскі — 12 000 руб. на месяц.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 — Асабовы рахунак: 

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |

Агулам

Касір

КВІТАНЦЫЯ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 — Асабовы рахунак: 

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |

Агулам

Касір М.П.

**Каб штотыдзень атрымліваць газету,**

дасылайце адрасы і грошы за газету. Кошт на месяц — 10 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газету **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) **Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага пераказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад’езду.**

Тры гады «НН» можна было атрымаць толькі падпісаўшыся праз Рэдакцыю. І мы завялі традыцыю дзякаваць усім тым чытачам, якія пералічалі грошы на выхад газеты.

### Дзякуй

**Васілю К., Галіне К., Аляксандру Т., Раісе А.** з Віцебску.
**В.В.** з Смаргонскага раёну.
**Яўгенію К.** з Шклоўскага раёну.
**Лідзіі А., Аляксею Ш., Аляксандру К.** з Баранавіцкага раёну.
**Юрыю Ч.** з Мазырскага раёну.
**Віктару К., Галіне Ч.** з Рэчыцкага раёну.
**Г.К., Юліі Д., Сяргею А., Антону М., С.Ш., Паўлу Е., І.К., Алене М., Ігару С., Сяргею Г., Іраідзе З., А.Л., А.С., Вадзіму Г., В.П., Я.І., Надзеі К., Сямёну Л., Валянціне А., А.Т., Ірыне З., Алене П., А.Х., Юрыю Л., А.К., Ніне К., Наталлі М., Уладзіміру В., Алегу М., К., А.Ш., Э.К., Мікалаю Б., Л.Л., С.К., П.Л., Віктару Б., Т.А., Р.Г., Г.Х.** з Мінску.

# Яшчэ адна дэвальвацыя ў 2009-м?

Яна не выключаная, залежыць ад дынамікі крызісу.

Паведамленне пра правядзенне Нацбанкам разавай дэвальвацыі рубля на 20,5% з’явілася ўвечары 1 студзеня. Акурат тады, калі большасць беларусаў адпачывала. Упраўленне інфармацыі галоўнага банку краіны паведаміла, што з 2 студзеня афіцыйны курс даляра ЗША будзе ўсталяваны на ўзроўні 2650 Br (на +20,45%, быў 2200 Br), еўра — 3703 Br (быў 3077,14), расійскага рубля — 90 рублёў 16 капеек (быў 76,89). Адначасова Нацбанк заявіў пра пераход да выкарыстання механізму прывязкі курсу беларускага рубля да кошыку замежных валют — даляр ЗША, еўра і расійскі рубель.

Людзі кінуліся ў абменнікі, але там валюты ўжо не прадавалі. Тады людзі ў першы дзень адкрыцця крамаў кінуліся скупляць патрэбшчыну і непатрэбшчыну — найперш бытавую тэхніку.

### Нашто зроблена?

Падзенне рубля адбылося на фоне сусветнага фінансавага крызісу і паўзучай дэвальвацыі валютаў некаторых суседніх краінаў. На афіцыйным узроўні тлумачыцца, што такі непапулярны крок закліканы ўдзешавіць беларускія экспартныя тавары, што сталі залежвацца на складах. Начальнік упраўлення інфармацыі Нацбанку Анатоль Драздоў паведаміў таксама, што дэвальвацыя была рэкамендацыяй МВФ — штосьці ў лесе здохла, што Лукашэнка вымушаны кіравацца рэкамендацыямі тых, каго яшчэ пару месяцаў таму малявалі лютымі ворагамі. Пра выдзяленне 2,5-мільярднага крэдыту стала вядома 31 снежня.

### Хто пацярпеў?

Разавая дэвальвацыя найперш закранула ўладальнікаў рублёвых дэпазітаў ды атрымальнікаў валютных крэдытаў — як фізічных, так і юрыдычных асобаў. Заробкі ў даляравым эквіваленце фактычна адразу вярнуліся да леташняга ўзроўню. Спажыўцоў чакае немінучы рост цэнаў спачатку на імпартныя, а пазней і айчынныя тавары. Адначасова з аб’яўленнем дэвальвацыі галоўны банк абвясціў пра павышэнне стаўкі рэфінансавання з 12 да 14%. Але беларускія банкі чакае няясная доля, бо яшчэ невядома, ці атрымаецца супакоіць насельніцтва, каб пазбегнуць адтоку ўкладаў. Людзі законна баяцца, што ў выпадку далейшага пагаршэння сітуацыі іх уклады проста замарозяць, нават у валюце.

### Што далей?

Большасць эканамічных экспертаў сыходзяцца ў адным — без структурных зменаў у эканоміцы пазбегнуць яшчэ адной дэвальвацыі.

Эксперт Інстытуту менеджменту і прадпрымальніцтва Алена Ракава не мае пэўнасці, што эфект ад разавай дэвальвацыі будзе дастатковым і доўгатэрміновым. На яе думку, яна дасць палёгку на пэўны час, але паступова дэфіцыт валюты можа зноў дасягнуць такіх маштабаў, што будзе не абысціся без яшчэ аднаго зніцэньвання рубля. На думку Ракавай, тое можа здарыцца пад восень.

Экс-старшыня Нацбанку Станіслаў Багданкевіч лічыць дзеянні ўладаў запозненымі і прагназуе няўхільнае скарачэнне золатавалютных рэзерваў, якія будуць «пад’ядацца» інфляцыяй і выдаткамі на падтрыманне банкаўскіх унёскаў насельніцтва.

### Верыць — не верыць?

Узровень інфляцыі ў 2009 эксперты прагназуюць на ўзроўні 20—30% і болей. Пры гэтым, як заўжды ў перыяды нестабільнасці, з’явяцца новыя магчымасці для ўзбагачэння найбольш актыўных і працаздольных слаёў насельніцтва.

Нацбанк, які абраны на ролю «вінаватага», абвяргае чуткі пра дэнамінацыю ды цвёрда абяцае ўтрыманне зафіксаванага курсу валютаў цягам году ў межах +/- 5% ад указанай пачатковай велічыні.

Сёння кожны мусіць вызначыцца сам, ці давярае ён Нацбанку пасля таго, што ўжо здарылася, кажа эканаміст Аляксандр Чубрык.

**Сямён Печанко**



PHOTO.BYMEDIA.NET

## Аляксандр Лукашэнка: Мы народу абяцалі

«Сёння галоўнае — утрымаць стабільнасць. Стабільнасць рубля, а значыць, стабільнасць усёй фінансавай сістэмы. Мы дасягнулі 2200. Усё, нельга больш. Мы народу абяцалі. І я сказаў старшыню Нацбанку — май на ўвазе, не дай Бог, маё слова будзе парушана. Прыйдзе Новы год — 5 працэнтаў... Вось вазьміце 5 працэнтаў ад 2200».

**23 снежня, адказваючы на пытанні журналістаў у Бярозе Брэсцкай вобласці.**

# Падзенне золатавалютных запасаў паскорылася

Нягледзячы на маніпуляцыі апошніх дзён 2008 году **(старонка 8)**, яны скараціліся за снежань на рэкордныя $582,6 млн (15,4%).

На 1 студзеня 2009 году яны склалі $3192,8 млн проці $4182,2 млн на пачатак 2008 г. Такія звесткі падае Белстат.

Гэта найбольшая лічба падзення за паўгоду: дагэтуль яны зменшыліся на $276,4 млн у лістападзе, на $68,1 млн у кастрычніку, на $459,7 млн у верасні і на $44,6 млн у жніўні. Усяго за пяць месяцаў яны скараціліся на $1431,4 млн. І тое толькі дзякуючы 1 млрд расійскага крэдыту, што быў атрыманы ў лістападзе.

За мінулы год ЗВР Беларусі зменшыліся на $989,4 млн (23,7%), хоць у студзені—ліпені яны выраслі на $442 млн (10,6%).

Для параўнання: ва Украіне, таксама ахопленай крызісам, ЗВР на канец году склалі 31,543 млрд даляраў і зменшыліся за год на 2,8%, або $918,8 млн. У нашых суседзяў падзенне рэзерваў было б таксама шпарчэйшым, калі б не 4,5-мільярдавы крэдыт МВФ.

Мяркуючы па першых днях студзеня, падзенне золатавалютных запасаў працягнецца. І ўчора, і сёння попыт на валюту на біржы перавышаў прапанову. 5 студзеня — на $20 млн, а 6 студзеня — на $24 млн.

**Мікола Бугай**

### Бензін ізноў выгадней купляць за рублі

Пасля дэвальвацыі рублёвыя цэны на паліва не змяніліся. У выніку купляць за рублі стала выгадней.

# Польская гаспадарка мае на крызіс імунітэт

За Бугам цешацца таму, што крызіс вельмі мала закрануў краіну. Паводле ацэнак, тэмпы росту ВУП знізяцца ўсяго да 3% у 2009 годзе і прыкладна да 3,5% у 2010-м. Што вельмі прыстойна на фоне ўсеагульнай дэпрэсіі. Польшча не зведала праблемаў, якія напаткалі Латвію, Расію, Беларусь.

Прычына? Іх некалькі.

Па-першае, доля банкаўскага сектару была меншая, чым у Латвіі ці Ісландыі. Шанцаванне.

Па-другое, аб’ём унутранага рынку вялікі — доля экспарту ў ВУП складае ўсяго каля 35%. Да прыкладу, Украіна церпіць ад ланцуговай рэакцыі на сусветных рынках.

Па-трэцяе, польская гаспадарка мала залежыць ад зменлівых цэнаў на сыравіну (у Беларусі — нафта, калій). Не Трэці свет.

Па-чацвертае, у адрозненне ад Венгрыі, бюджэт і выдаткі краіны былі ўраўнаважаныя апошнія гады. Меру знялі.

Нарэшце, урад даволі гнутка рэагаваў на пагрозы. Курс злотага, што складаў 2,7 за даляр у сярэдзіне 2007 г., а пасля вырас да 2,1 на піку падзення амерыканскай валюты ў 2008 г., упаў да 3,0 пры канцы году, але засведчыў новыя тэндэнцыі да росту па меры добрых вестак аб стане гаспадаркі.

**МБ**

# «Сапраўдны крызіс да нас прыйдзе вясной»

Эканаміст **Павел Данейка** пра эканамічныя цяжкасці.

**«Наша Ніва»: Апошнім часам Вы курсіруеце паміж Мінскам, Масквой і Кіевам. Дзе найбольш адчуваецца фінансавы крызіс?**

**Павел Данейка:** Безумоўна, найперш ён праявіўся ва Украіне, цяпер вось у Расіі і толькі пачынае праяўляцца ў Беларусі. Думаю, што больш яскравыя праяўленні пачнуцца ў нас вясной, не раней. Праяўляцца ён зможа ў зніжэнні ці нявыплаце заробкаў, павелічэнні беспрацоўя. З нашага рэгіёну Украіна найлягчэй павінна выйсці з крызісу, для Расіі ж яго вынікі могуць быць катастрафічнымі. Беларусь недзе пасярэдзінцы.

**«НН»: Якія наступствы фінансавага крызісу будуць для Беларусі?**

**ПД:** Такія ж, як для ўсяго свету. Мы можам чакаць зніжэння ВУП на 10% і больш. Адзінае, што Беларусь можа выходзіць з крызісу крыху больш, калі не будуць зменены ўмовы эканамічнага асяроддзя. Бо чым вышэйшае дзяржаўнае рэгуляванне, тым пазней ты ўваходзіш і выходзіш з крызісу, і тым даўжэйшы ён атрымліваецца. Думаю, што падзенне можна будзе спыніць ужо ў 2009-м, але выхад з крызісу зойме 5—7 гадоў.

**«НН»: Які ўзровень беспрацоўя можа аказацца ў краіне?**

**ПД:** Гэта залежыць не толькі ад падзення ВУП, але і ад сістэмы занятасці насельніцтва, стаўленнем наймальніка да звальненняў. Могуць жа проста забараняць звальняць. Але рэальнае беспрацоўе можа скласці каля 15%.

**«НН»: А якія шляхі выхаду з крызісу Вам бачацца?**

**ПД:** Гэта спалучэнне лібералізацыі з ручным кіраваннем. Пры гэтым трэба будзе прымаць нейкія жорсткія адміністрацыйныя дзеянні. Другога шляху не існуе. Ва ўмовах крызісу хуткасць прыняцця рашэнняў становіцца важнейшай за правільнасць рашэнняў. І тут адміністрацыйнае кіраванне можа аказацца нават больш эфектыўным. Але пры ўсім гэтым неабходны нейкі набор ліберальных метадаў стымулявання.

**Гутарыў Зміцер Панкавец**

**Павел Данейка**

нарадзіўся 3 красавіка 1961 году ў Мінску. Скончыў гістфак БДУ (1986). Спецыялізацыя — макраэканоміка. Кандыдат эканамічных навук. У 1993 стварыў Інстытут прыватызацыі і менеджменту. З 2007 рэктар Moscow Business School. Быў дэпутатам Вярхоўнага Савету 13 склікання. Сябар АГП. Жанаты, трое дзяцей.

# Элегантны дэфолт

Эканамісты Нацбанку, а з імі Багданкевіч і Раманчук, якія падтрымліваюць дэвальвацыю, — недальнабачныя. Піша эканаміст **Уладзімір Акуліч**.

У краіне адбыўся самы сапраўдны дэфолт. На гэты раз ён завуаляваны пад нібы зменены механізм курсаўтварэння. Вось толькі механізм чамусьці зменены такім чынам, што амаль кожны з беларусаў прачнуўся ў новым 2009 годзе бяднейшым на 20%. А зараз яшчэ ўсплёснецца інфляцыя, і людзі збяднеюць яшчэ больш. 1% дэвальвацыі ў Беларусі прыводзіць да 1% росту цэнаў.

Эканамісты як Багданкевіч і Раманчук, якія падтрымліваюць дэвальвацыю — недальнабачныя. Яны, як і эксперты з Нацбанку, апраўдваюць зніжэнне вартасці нацыянальнай валюты патрэбай падтрымкі экспарцёраў. Але ж паводле Канстытуцыі акурат Нацбанк мае падтрымліваць стабільнасць нацыянальнай валюты. Ён жа робіць усё наадварот. Сваімі дзеяннямі ён паніжае рэальныя даходы насельніцтва і не дае тым самым сфармавацца дастатковаму ўнутранаму плацежаздольнаму попыту, у выніку чаго наша краіна ўвесь час застаецца залежнай ад экспарту, ад кан'юнктуры замежных рынкаў.

Пры такой палітыцы абменнага курсу ў нас ніколі не будзе так, як, скажам, у Германіі ці ЗША, якія спажываюць 80—90% свайго ж ВУП, бо дзесяцігоддзямі трымалі стабільнымі свае нацыянальныя валюты — у Германіі ў часы нямецкай маркі нават быў прыняты адпаведны закон — і змаглі тым самым забяспечыць высокія даходы насельніцтва сваіх краінаў. Мы ж, як і дэкларуецца, ідзем шляхам Кітаю: нарошчваем вытворчасць, намагаемся прадаць прадукцыю за мяжу; эканоміка краіны пры гэтым увесь час застаецца празмеру залежнай ад экспарту і таму перыядычна праводзіцца зніжэньванне нацыянальнай валюты, каб падтрымаць цэнавую канкурэнтаздольнасць экспарту; пры гэтым адначасова з кожнай дэвальвацыяй скарачаюцца рэальныя даходы людзей, а зарплаты не выходзяць на ўзровень развітых краінаў, не фармуецца досыць ёмісты ўнутраны рынак, які зрабіў бы эканоміку краіны менш залежнай ад кан'юнктуры на замежных рынках.

Хто не даваў нашаму ураду за апошнія 15 гадоў стварыць патрэбны вытворчы патэнцыял?

Чаму грамадзяне плацяць за тое, што прэзідэнт і яго ўрады доўгі час не давяралі замежным інвестыцыям, а калі схамянуліся, было ўжо позна, бо грымнуў сусветны фінансавы крызіс?

За 15 гадоў пры Машэраву ў Беларусі збудавалі прыкладна 400 буйных прамысловых вытворчасцяў, а колькі заводаў размешчана ў Беларусі за гады кіравання Лукашэнкі — 20—30, не больш. Хто заплаціць за памылку, што ўлады 15 гадоў не маглі зразумець ролю малога і сярэдняга бізнесу, ролю сферы паслуг для эканомікі, якая магла б стаць той самай падушкай бяспекі і паглынаць частку плацежаздольнага попыту, не дапускаючы пакрыцця яго за кошт імпарту, у выніку чаго ствараліся праблемы ў выглядзе росту адмоўнага замежнагандлёвага сальда, пагаршэння стану плацежнага балансу і росту замежнае дзяржаўнае запазычанасці, ціску на курс нацыянальнай валюты. Г. зн. менавіта тых праблем, якімі сёння фінансісты апраўдваюць патрэбу дэвальвацыі рубля.

**1% дэвальвацыі ў Беларусі прыводзіць да 1% росту цэнаў.**

І пасля, варта шчыра сказаць, што зніцэньванне нацыянальнай валюты — гэта перакладанне сродкаў з адной кішэні — кішэні насельніцтва — у кішэню дзяржавы. Дэвальвацыя — не што іншае як пабіранне з насельніцтва дадатковага гэтак званага інфляцыйнага падатку. Бо ж пасля дэвальвацыі ў такой жа ступені аўтаматычна адбудзецца рост цэнаў на імпартныя тавары, а скоранька да іх падцягнуцца і цэны на айчынныя тавары. Разам з ростам цэнаў вырасце ў абсалютным значэнні і памер ускосных падаткаў (такіх, як ПДВ, акцызы ды інш.), доля якіх у дзяржбюджэце складае 70—80%. Так што на фоне скарачэння рэальных даходаў за кошт гэтых сабраных дадаткова грошай нават падвысяць пенсіі пенсіянерам.

З моманту ўвядзення беларускага рубля Беларусь лідзіруе па тэмпах зніцэньвання нацыянальнай валюты нават сярод краінаў СНД, не кажучы пра Усходнюю Еўропу.

Калі дадаць тыя чатыры нулі, якія былі знятыя ў часе дзвюх дэнамінацый, сёння 1 даляр мусіў бы каштаваць 26 500 000 рублёў (на другім месцы такі ж аўтакратычны Туркменістан — 7 125 000). Для параўнання: з улікам усіх дэнамінацый у Расіі з моманту ўвядзення расійскага рубля, 1 даляр ЗША павінен быў бы каштаваць сёння ўсяго 29 000 расійскіх рублёў. Літва мела б 263 літы за 1 даляр; Эстонія — 117 кронаў за 1 дал.; Латвія — 107 латаў за 1 дал. Прычым у краінаў Балтыі ўсё зніцэньванне прыпала на самыя першыя постсавецкія гады. Пасля ўвядзення паўнавартых нацыянальных валютаў іх курс вагаўся, але ў рамках вагання курсу еўра да даляра.

Беларуская валюта зніцэнілася да даляра ў 4 разы больш за туркменскую, у тысячу разоў — за расійскую, у 100 тысяч разоў — за літоўскую.

Усё гэта прыводзіць да нізкіх узроўняў беларускіх зарплатаў у даляравым вымярэнні. Яны ніжэйшыя нават проці расійскіх, ужо не кажучы пра цэнтральнаеўрапейскія. Чаго не скажаш пра цэны. Інакш кажучы, мы ўжо надэвальваваліся гэтулькі, што годзе на многія леты наперад.

Паводле метадалогіі ААН, развітай лічыцца тая краіна, дзе сярэднямесячны заробак складае не менш за 1 000 даляраў. Пры сённяшнім жа абвале беларускага рубля, будзем называць рэчы сваімі імёнамі, сярэднямесячны заробак у Беларусі скароціцца са снежаньскага ўзроўню недзе даляраў 450 да ўзроўню даляраў 370.

**З моманту ўвядзення беларускага рубля Беларусь лідзіруе па тэмпах зніцэньвання нацыянальнай валюты нават сярод краінаў СНД.**

| Краіна | тэмпы зніцэньвання нацыянальнай валюты |
|---|---|
| Беларусь | 26 500 000 |
| Туркменістан | 7 125 000 |
| Расія | 29 500 |
| Літва | 263 |
| Эстонія | 117 |
| Латвія | 107 |

**ПАРАЎНАННЕ**

**За 15 гадоў пры Машэраву ў Беларусі збудавалі прыкладна 400 прамысловых вытворчасцяў, а за гады кіравання Лукашэнкі — не больш за 30.**

**АД РЭДАКЦЫІ**

### Чым каментары розняцца ад артыкулаў?

Новыя чытачы НН заўважылі, што ў газеце даволі шмат палосаў, што называюцца «Каментары». Гэта робіцца для таго, каб аддзяліць аб'ектыўныя артыкулы, напісаныя супрацоўнікамі Рэдакцыі, ад матэрыялаў суб'ектыўнага характару. Іх пішуць як журналісты «НН», так і аўтары не з газеты. Яны могуць насіць дыскусійны характар. У іх фармулююцца новыя ідэі.

Напрыклад, гэты тэкст быў змешчаны на паласу «Каментароў», бо можа быць і іншая ацэнка дэвальвацыі. Яе Вы знойдзеце ў каментарах Віталя Сіліцкага **(старонка 7)**, Руслана Равякі і Барыса Тумара **(старонка 5)**.

# Дэвальвацыя даверу

Стала ясна, чаму Лукашэнка чытаў навагодняе віншаванне як з пятлі дастаты. Піша **Барыс Тумар**.

Беларусь пры сваёй хвалёнай стабільнасці застаецца эканамічна слабым гаспадарствам. Яна 4-й з еўрапейскіх краінаў дэвальвавала сваю валюту. Што ж — ні Венгрыя, ні Ісландыя, ні Украіна не спынілі свайго існавання як дзяржавы. Латвія выбрала стабільнасць валюты і рэжым строгай эканоміі. Беларусь аддала перавагу іншаму рэцэпту. Не унікальнаму. Мы ж і так ведалі, што цудаў не бывае, праўда? У тым ліку і беларускага эканамічнага. А калі забыліся, дык вось нам напамін, і МВФ тут ні пры чым.

Пасля навагодняй дэвальвацыі давер да гаспадарчых заяваў Лукашэнкі надоўга знізіцца, вось і ўся батлейка.

Ці так страшная тая дэвальвацыя? Горка плачуць тыя, хто набраў валютныя крэдыты. Ідэолагі перастануць успамінаць планы росту заробкаў. Турфірмам час пераключацца назад на Крым. Затое ўздыхнуць з палёгкай экспарцёры.

Аднак дэвальвацыяй турбуленцыі не скончацца.

Дэвальвацыя — толькі адна з праяваў таго, што эканоміка пайшла ходырам. Пераацэнка рубля падсцябне інфляцыю. Інфляцыя абумовіць рост заробкаў для таго, каб стрымаць людзей ад выхаду на вуліцу. Рост заробкаў ізноў выкліча ціск на золатавалютныя запасы, якія, — аказваецца, прыўкрасная маркіза — у Беларусі на 17-м годзе незалежнасці заставаліся на недапушчальна нізкім узроўні. І мала будзе проста крэдытаў, каб вярнуць машыну ў нармальны ход. Толькі новы ўзлёт цэнаў на нафту гарантуе нармалізацыю. Сачыце за цэнамі на нафту — ад іх будзе залежаць лёс вашых ставак.

**«Панарама»: Ні слова аб дэвальвацыі**

Галоўнай падзеяй тыдня БТ палічыла адкрыццё Каляднага турніру па хакеі сярод аматарскіх камандаў на прызы Аляксандра Лукашэнкі, дзе галоўны прэтэндэнт на перамогу — каманда Аляксандра Лукашэнкі. «Галоўнаму» сюжэту было адведзена 12 хвілінаў эфіру.

Дарэчы, сярод удзельнікаў турніру аматарскіх камандаў толькі два чалавекі не былі ў мінулым прафесійнымі хакеістамі.

Далей ішлі рэпартажы пра ўсё што хочаш — аб развіцці агратурызму і джыгітовачны казацкі тэатр.

Аб падзеі, якая зачапіла ўсіх, — ані слова.



PHOTO.BYMEDIA.NET

# Паслянавагоднія зніжкі

1 студзеня прыехалі ў Баранавічы нейкія хлапцы і скупілі ў валютчыкаў амаль усю валюту, тыя нават з дому цягнулі запасы. Піша **Руслан Равяка**.

Навагодні падарунак у выглядзе падзення курсу беларускага рубля ўжо паспеў парадаваць і засмуціць усіх жыхароў нашай краіны. Парадаваць тых, хто мае крэдыты ў беларускіх рублях ці вялікія зберажэнні ў валюце, засмуціць усіх астатніх.

Новая байка гуляе па Баранавічах: 1 студзеня прыехалі ў горад нейкія хлапцы і скупілі ў валютчыкаў амаль усю валюту, тыя нават з дому цягнулі запасы. Матывавалі гэта тым, што тэрмінова трэба набыць машыны, а банкі і абменнікі не працуюць... Якое ж было здзіўленне валютчыкаў, калі на наступны дзень абвесцілі новыя курсы Нацбанку. Як кажуць — розныя магчымасці ў розных людзей, але галоўнае — своечасовае валоданне інфармацыяй.

Народ наш дасюль верыць у свяцтва і сяброўства — новыя ж курсы нехта рыхтаваў, а таму па-чалавечы зразумела, што загадзя мог пад сакрэтам шапнуць сваім... Як за савецкімі часамі. Зрэшты, з тымі савецкімі часамі людзі і параўноўваюць сучасныя падзеі. Сёлета (у 2009 годзе) чуў у аўтобусе разважанні старых — маўляў, пару апошніх гадоў мы жылі як у застоі — было ўсё. Апошнія ж падзеі параўноўвалі з рэформай Паўлава 1990 году, прачнуліся ранкам і...

Адзін пенсіянер скардзіўся, што паверыў у непахіснасць нашага рубля і за месяц да гэтага перавёў усю валюту (якая задурыла старэчую галаву ў апошні час сваімі скокамі) у «зайцы», ды паклаў іх у банк пад 20% гадавых! На святы банкі пазачынялі, і нават забраць свае грошы не можа, бо ад пластыкавай карткі адмовіўся з эканамічных меркаванняў.

Ужо 3 студзеня просты люд ламануўся ў толькі адчыненыя пасля святаў дзяржаўныя універмагі, бо прыватныя спрэс пазачыняліся на пералік. Скупалі ўсё, як жартавалі, «па зніжках» — адносна новага курсу даляра. Колькасць людзей на вуліцах, што цягнулі тэлевізары, пралкі і DVD-прайгравальнікі не ідзе ў параўнанне нават з калядным распродажам.

Зрэшты, тое падзенне нашага рубля пойдзе на карысць айчынным прадпрыемствам, што працуюць на экспарт. Цэны на нашу прадукцыю пайшлі долу, калі пераводзіць на валюту. Таму нейкая канкурэнцыя ў свеце будзе. Пакуль распрададуць тое, што на складах. Бо паслянавагодняя прадукцыя, на жаль, будзе даражэйшаю — за тыя самыя энерганосьбіты плацім валютаю...

*Баранавічы*

# Чаму маўчаць партыі і рухі?

Палітычныя партыі ніяк не адрэагавалі на дэвальвацыю беларускага рубля. Гэта ўжо не першы падобны выпадак. Аналітыкі выказаліся, СМІ даюць інфармацыю, а палітыкі маўчаць. Мінулыя гады апазіцыйныя лідэры падвяргаліся крытыцы за маўчанне па пытаннях паставак у краіну газу, рэформы сістэмы адукацыі. Што стаіць за гэтым маўчаннем? Негалосная падтрымка афіцыйнага курсу ці адсутнасць уласнай яснай альтэрнатывы? Адказваюць лідэры апазіцыйных партый.

**Анатоль Лябедзька, старшыня АГП:** «Мы абмяркоўвалі з калегамі гэтую сітуацыю. І, безумоўна, у нас будзе пазіцыя. Яна будзе агучана літаральна цягам двух-трох дзён, якія патрэбныя для некаторых узгадненняў. У АДС усё ж розныя структуры і мы паважаем пазіцыю кожнай з іх. Пазіцыя ёсць у кожнага, але супольная будзе крышачку пазней».

**Сяргей Калякін, лідэр ПКБ:** «Сама па сабе дэвальвацыя не такая страшная для беларускай эканомікі. А вось што адбываецца ўслед, калі мяняюцца цэннікі, то гэта зусім іншая справа. Усё, што адбылося, будзе ацэнена намі ў комплексе. Нельга было адразу рэагаваць, бо ва ўлады не было іншых магчымасцей. А вось сённяшнія дзеянні паказваюць, што ўсе эканамічныя праблемы ўлады будуць вырашаць за кошт простых людзей».

**Вінцук Вячорка, намеснік старшыні Партыі БНФ:** «Мы не адмоўчваемся і не хаваемся. Рыхтуецца аб'ёмны і сур'ёзны дакумент. Пакуль што мы канстатуем: беларускі народ быў падмануты. А падругое, гэта апошнія захады ўлады, прынятыя знянацку. Самае галоўнае, што адбылося, — рашэнне было прынятае непразрыстае. Не было парламенцкіх, грамадскіх дыскусій. Тут альбо мы кажам: давайце не замінаць Аляксандру Лукашэнку, і саступім убок, прыкрываючыся незалежнасцю. Альбо мы займаем сваю пазіцыю. Разам з тым, трэба разумець, што мы не выйдзем з эканамічнага крызісу без разняволення людзей і краіны».

**Зміцер Панкавец**

# Іронія лёсу, або З цяжкім газам

**Кожны год пачынаецца з таго, што Расія камусьці перакрывае газ. Як бароніцца Кіеў?**

За 2008 год Украіне ўдалося назапасіць рэкордныя рэзервы газу ў падземных газасховішчах. Яна давяла іх да 30 млрд куб. м, з якіх 17 млрд належалі дзяржаўнаму «Нафтагазу». Для параўнання: гадавое спажыванне газу складала ў 2008 каля 56 млрд т, прычым з іх сама Украіна здабывае 20 млрд. Да таго ж, частку газу можна замяніць мазутам. «Штодзённае спажыванне з запасаў у першыя 6 марозных дзён расійскай блакады складала каля 200 млн куб. м», — заявіў віцэ-прэм’ер ураду Алег Дубіна.

Між тым «Газпром» мае мінімальныя запасы газу ў Балгарыі, Харватыі, Македоніі і параўнальна невялікія запасы ў Славаччыне, Румыніі, Грэцыі, Італіі, Босніі і Герцагавіне, Аўстрыі, Малдове, Чэхіі — краінах, што пацярпелі ад расійска-ўкраінскай газавай спрэчкі. Пікантна, што першым паварот рубільніка на расійска-ўкраінскай мяжы адчула Прыднястроўе — кліенцкая тэрыторыя, падкантрольная Маскве, між Украінай і Малдовай. Тыраспаль стаў першым горадам Еўропы, дзе перакрыццё газу адбілася адключэннем цёплай вады і зніжэннем тэмпературы ў дамах.



Перавага ў запасах газу дазваляе Кіеву адчуваць сябе адносна пэўна. Ва Украіне спадзяюцца, што «Газпром» здасца першы.

Расія патрабавала з Украіны 250 даляраў за тысячу кубаметраў пры захаванні стаўкі за транзіт на ўзроўні 2008 году. Украіна пагаджалася на 235 даляраў і патрабавала росту аплаты за транзіт (1,7 даляра за тысячу тонаў на 100 км сёння).

Расійскую грамадскую думку да канфлікту рыхтавалі загадзя. Спрэчцы папярэднічала антыўкраінская кампанія ў расійскіх СМІ. Расійскае ТВ заяўляла, што Украіна сама перакрыла краны на мяжы і ўхіляецца ад перамоваў.

Паводле некаторых ацэнак, у адпаведнасці з расійска-ўкраінскім трохгадовым кантрактам цана сёлета павінна была б узрасці да 238 даляраў. Са стаўкамі на транзіт цяжэй — яны розныя ў розных краінах і вар’ююцца ад 1 да 6 даляраў. Паводле кантракту яны павінны былі захавацца на ўзроўні 1,7 да канца 2010 году. Аднак Украіна мяркуе, што перагляд цэнавой формулы па газе вымагае перагляду і транзітнае стаўкі.

Газавыя канфлікты скаланалі Еўропу ўвесь час пасля Аранжавай рэвалюцыі ў Кіеве. Газ па чарзе адключалі Украіне і Беларусі, кожны раз без вялікага эфекту, але з шкодай для рэпутацыі бакоў.

Можна меркаваць, што мэтай Пуціна ёсць не столькі шантаж Украіны, колькі спроба стварыць штучны дэфіцыт энерганосьбітаў у Еўропе, каб узняць цэны на нафту, і пралабіраваць дарагія праекты пабудовы газаправодаў у абыход Украіны і Беларусі па дне Балтыйскага і Чорнага мораў.

**Мікола Бугай**

## Раманчук і Вардамацкі спатрэбіліся ўраду

31 снежня прэм’ер-міністр Сяргей Сідорскі падпісаў распараджэнне аб стварэнні міжведамаснай рабочай групы для выпрацоўкі плану дзеяння па развіцці краінавага маркетынгу. Кіраўніком групы прызначаны намеснік міністра замежных справаў Яўген Еўдачэнка.

У распараджэнні Сідорскага гаворыцца: да «1 лютага забяспечыць распрацоўку праекту плану дзеяння па развіцці краінавага маркетынгу, які прадугледжвае прапановы аб кірунках узаемадзеяння з замежнымі інвестарамі, а таксама канкрэтныя меры па інфармаванні замежных інвестараў аб інвестыцыйных магчымасцях у Беларусі».

У працоўную групу ўвайшлі 14 чалавек, у тым ліку два прадстаўнікі незалежнага сектару — кіраўнік навукова-даследчага цэнтру Мізэса Яраслаў Раманчук і дырэктар лабараторыі аксіметрычных даследаванняў «Новак», старшыня Рады Беларускага інстытуту стратэгічных даследаванняў Андрэй Вардамацкі.

«Ніякіх паседжанняў яшчэ не было, — кажа Я.Раманчук. — Пра ўступленне ў гэтую групу са мной не гаварылі чыноўнікі, была размова толькі з людзьмі з сферы маркетынгу. Я даў сваю згоду, але да апошняга не верыў, што ўрад можа гэта зацвердзіць».

Эканаміст відавочна рады прапанове: «Гэта выдатная пляцоўка для данясення сваіх ідэй. Калі лорд Бэл кажа толькі пра касметычны рамонт, то мы гаворым пра капітальны. Што недастаткова проста прывабнай абгорткі, каб сюды прыйшлі інвестыцыі».

Упершыню ў міжведамасную працоўную групу трапілі два апазіцыйныя інтэлектуалы.

**Зміцер Панкавец**

### Паўтор «Батлейкі» на АНТ у панядзелак

Першы ў гісторыі беларускамоўны навагодні канцэрт АНТ будзе дэманстравацца ў паўторы ў шчодры вечар на стары Новы год: 12 студзеня (панядзелак), 21.30.

Тэлеспектакль быў паказаны на тэлеканале ў навагоднюю ноч. Водгукі на яго былі супярэчлівыя: адны цешыліся мове і геніяльным песням «Песняроў». Другія ганілі за мастацкую слабасць і перабор з эротыкай на мяжы парнаграфіі.

У галоўных ролях — міс-Беларусь-2008 Вольга Хіжынкова і дэпутат, былы актор Купалаўскага тэатру Генадзь Давыдзька.

**МБ**

## Загінулі пад бардзюрамі

Сталі вядомыя прычыны трагедыі ў Пінскім пагранатрадзе, што здарылася 18 снежня на аўтадарозе Столін—Жыткавічы ў раёне Давыд-Гарадка. У той дзень быў галалёд. Грузавік, у якім ехала змена памежнікаў у складзе 14 чалавек, з’ехаў з трасы і перакуліўся. Загінуў адзін вайсковец тэрміновай службы, два кантрактнікі і адзін прапаршчык. Дзесяць вайскоўцаў траўмаваныя.

Справай займаецца вайсковая пракуратура памежных войскаў. Падрабязнасцяў тут не даюць.

Пасля такіх здарэнняў у вайсковых частках па ўсёй краіне ладзяцца сходы, на якіх паведамляюць пра такія пазаштатныя сітуацыі ды робяць арганізацыйныя высновы. Як паведамілі вайскоўцы адной з аўтамабільных частак, ім расказалі, што ў той дзень у грузавіку з памежнікамі перавозілі бетонныя бардзюры, якія смяротна траўмавалі вайскоўцаў у момант аварыі.

**Сямён Печанко**

## Літва трымаецца моцна, а Латвіі дапамагае Эстонія

Літва не мае патрэбы ў падтрымцы Міжнароднага валютнага фонду, заявіў прэм’ер-міністр краіны Аўдрус Кубілюс. З яго словаў, фінансавая сістэма Літвы пакуль трымаецца добра.

А вось у Латвіі, у аснове працвітання якой ляжаў банкаўскі сектар, справы кепскія. ВУП ужо пачаў падзенне. Справы пагаршаюцца тым, што латвійскія банкі спецыялізаваліся на абслугоўванні шэрага расійскага капіталу. А падзенне цэнаў на нафту падкасіла гаспадарку Расіі.

Каб даць рады крызісу, Латвія звярнулася да міжнародных арганізацый па пакет фінансавай дапамогі. Пазыкі краіне памерам 4,5 млрд даляраў даюць МВФ, Еўрасаюз, Сусветны банк, а таксама асобныя краіны, у тым ліку суседняя Эстонія.

**МБ**

### Два крокі назад

Мінская друкарня «Плутас-Маркет» ад 3 студзеня скасавала дамову на друкаванне незалежнага штотыднёвіка «Борисовские новости».

А напярэдадні Новага году рэдакцыя атрымала яшчэ адзін падарунак — Барысаўскі райвыканкам скасаваў ліцэнзію на раздробны гандаль перыядычнымі выданнямі ў выдаўца «Борисовских новостей».

**ЗП**




**Новы міністр замежных справаў Літвы Вігаўдас Ушацкас наведаў Мінск. На перамовах са сваім беларускім калегам Сяргеем Мартынавым ён заклікаў Беларусь актыўней супрацоўнічаць з Еўропай.**

## 1000-годдзе Літвы

Зварот міністра замежных справаў Літвы да беларусаў

Шаноўныя беларусы!

У 2009 годзе мы святкуем тысячагоддзе Літвы, сталіца якой Вільня робіцца культурнай сталіцай Еўропы ‘2009.

Сардэчна запрашаю вас наведаць святочныя мерапрыемствы ў Літве, бо гэта ёсць дата старасветнай гісторыі, што яднае нашыя народы.

Карыстаючыся таксама нагодай, віншую ўсіх беларусаў з Калядамі і Новым годам!

**З павагай,**
**міністр замежных справаў Літвы**
**Вігаўдас Ушацкас**

# Балючае вяртанне ў рэальнасць

**Дэвальвацыя падвяла рысу пад беларускім эканамічным цудам. Што можа зараз рабіць урад і што можа прапанаваць апазіцыя? Піша Віталь Сіліцкі.**

З аднаго боку, дэвальвацыя — гэта сапраўды наступства памылковай эканамічнай палітыкі беларускіх уладаў. З другога — цяжка зразумець, чаму на ўрад і Нацбанк накінуліся акурат тады, калі ён пачаў гэтую палітыку мяняць, а не тады, калі цягам многіх гадоў назапашваліся праблемы, якія і прывялі да 1 студзеня 2009 г. Зрэшты, Яраслаў Раманчук крытыкаваў гэты ўрад заўжды. Але ўсё ж такі настойваю — урад і Нацбанк мелі рацыю. Пытанне ў тым, ці будуць адэкватнымі іх наступныя крокі. Улада адышла ад папулісцкай палітыкі, навучылася трымаць у руках скальпель. Цяпер справа за тым, каб маніпуляцыі са скальпелем пайшлі на карысць пацыенту.

Наагул, адна з найвялікшых праблемаў, якая выявілася цягам апошняга тыдня, — гэта неймаверна нізкі ўзровень эканамічнай пісьменнасці нашага грамадства. Што лагічна: нават у Наргасе эканомікс не выкладаюць. (Здаецца, сітуацыя з сексуальнай пісьменнасцю ў СССР, дзе сексу не было, была нават трошкі лепшай.) Тое, што насельніцтва ўспрымае абменны курс і яго ваганні як валютарысцкую з'яву, якая залежыць ад волі ўладаў, урэшце саслужыла дрэнную службу самому насельніцтву — застрахавацца ад непрыемнасцяў здолелі акурат тыя, хто ў эканоміцы трошкі разумее. Вядома, пад уплывам народнага гневу і ў прэсы, і ў аналітыкаў ёсць спакуса кінуцца ў голы папулізм. Заклікаю калегаў да прафесійнага падыходу і адказнасці, і пазбягання высноваў, напрыклад, што ўлада мусіла загадзя параіцца з грамадствам наконт дэвальвацыі (пэўна, каб у банках вынеслі дзверы, а з іх — сейфы).

Дэвальвацыю выклікае дэфіцыт плацёжнага балансу, які сам па сябе з'яўляецца наступствам таго, што краіна спажывае больш, чым зарабляе. Гэтыя нажніцы забяспечваюцца імпартам, за які трэба плаціць. Штучнае спажыванне звычайна падтрымліваецца фіксаваным курсам нацыянальнай валюты — калі курс прывязваецца, а дзяржава працягвае друкаваць грошы, павышаецца ўзровень унутраных цэнаў у прапорцыі да кошту імпарту, і спажыванне імпарту рэзка павялічваецца. Гэтае спажыванне аплачваецца тым, што дзяржава падтрымлівае курс нацыянальнай валюты тратай золатавалютных рэзерваў. Калі тых пачынае не хапаць, адбываецца дэвальвацыя. Апошняя можа быць ці планавай, ці, як здарылася ў Расіі падчас крызісу 1998 г., абвальнай і некантраляванай.

Сама па сабе дэвальвацыя прыводзіць да рэзкага зніжэння ўзроўню жыцця за кошт скарачэння спажывання імпарту, але ратуе нацыянальнага вытворцу, робячы яго прадукцыю больш канкурэнтаздольнай на замежных рынках. Эканоміка атрымлівае шанец на выздараўленне, таму што пачынае больш прадукаваць і менш спажываць.

Вядома ж, гэтае выздараўленне аплачваецца грамадзянамі. Аднак грамадства і спажывала ў добрыя часы, калі краіна жыла не па сродках. І тут размовы пра тое, што хтосьці жыраваў а хтосьці жыў на 350 тысячаў, з пункту гледжання сухой матэматыкі абсалютна бессэнсоўныя. Грошы — гэта агрэгат, сярэдняя тэмпература па шпіталі.

Што было рабіць у беларускай сітуацыі, дзе наступствы недальнабачнай эканамічнай палітыкі (адміністрацыйнае падвышэнне заробкаў, пераацэнка абменнага курсу) супалі з такімі выклікамі, як сусветны крызіс, які прывёў да знікнення нафтавай рэнты, рэзкага скарачэння попыту на нашу прадукцыю і яшчэ большай страце яе канкурэнтаздольнасці за кошт абвальнай дэвальвацыі ў краінах, якія з'яўляюцца асноўнымі нашымі рынкамі? Да канца году склалася сітуацыя, калі сталі імкліва вычэрпвацца золатавалютныя рэзервы краіны. За восень яны скараціліся на траціну, за снежань гэтае скарачэнне магло толькі паскорыцца. Плаўная дэвальвацыя, якую абаранялі мае шаноўныя апаненты (такія, як спадар Раманчук і прафесар Багданкевіч), магла б прывесці да таго, што недзе ў лютым гэтыя рэзервы знізіліся б да катастрафічнага ўзроўню і дэвальвацыя б стала некантраляванай. Так, хтосьці паспеў бы выратаваць свае ашчаджэнні ў студзені, але за гэта было б заплачана яшчэ ніжэйшымі заробкамі і пенсіямі недзе з сакавіка. Карацей, народ бы ўсё роўна заплаціў за памылкі ўраду, прычым хутчэй за ўсё ў большым аб'ёме.

Адным з аб'ектаў даследавання маёй дысертацыі была праграма макраэканамічнай стабілізацыі ў Венгрыі ў 1995 годзе, дзе сітуацыя была на дзіва падобная — вялізарны ўзровень сацыяльных абавязацельстваў дзяржавы пры пераацэненым абменным курсе і запаволенай прыватызацыі. Аднамомантная дэвальвацыя дазваляе пазбегнуць фінансавай панікі (проста за кошт таго, даруйце за цынізм, што яна адразу канфіскуе пэўную частку грошай у насельніцтва), і гэта дазваляе хутка прывесці эканоміку ў стан раўнавагі. Але тут пачынаюцца пытанні, што рабіць пасля дэвальвацыі! І тут ужо — ваш выхад, урад!



**Па—вашаму, улада мусіла загадзя параіцца з грамадствам наконт дэвальвацыі?**

Першы крок тут — працяг палітыкі прывязкі валюты, хай да кошыку. Бо пытанне фіксаванага абменнага курсу — гэта палітычнае пытанне ў Беларусі. Моцным рублём гарантаваліся рэальныя даходы насельніцтва і куплялася яго лаяльнасць. Улада паказала, што хоча і дагэтуль захаваць такі сацыяльны кантракт, хай і на ўзроўні, на 20% ніжэйшым. Праблема ў тым, што пры недаверы да ўлады, які пасеяла дэвальвацыя, чаканні новых падвохаў будуць павялічвацца, а ва ўмовах крызісу забяспечыць стабільны абменны курс будзе неймаверна цяжка. Што тычыцца ўласна палітыкі абменнага курсу, уладам варта было б прыняць яшчэ адно мужнае рашэнне і перайсці або да паўзучай прывязкі рубля (паступовай і загадзя аб'яўленай дэвальвацыі 1—2% у месяц, што пры ўмове больш таннага рубля ўжо цалкам магчыма), або наўпрост адмовіцца ад любой прывязкі і перайсці да рынкавага механізму вызначэння курсу.

Але тут для ўраду ўзнікаюць вялікія праблемы. Галоўнае — што прапанаваць народу цяпер? Бо праз некалькі месяцаў ці нават тыдняў, калі кароткатэрміновы эфект ад дэвальвацыі міне, для забеспячэння фінансавай стабільнасці стануць патрэбныя грунтоўныя рэформы. Такія, як скарачэнне дзяржаўных выдаткаў, прыватызацыя і інвестыцыі. На парадак дня ўстаюць грунтоўныя структурныя рэформы, з якімі Беларусь безнадзейна спазнілася.

Вось тут і ўзнікае прастора для дзеяннаў палітычнай апазіцыі і незалежнага грамадства. Сітуацыя чымсьці нагадвае нафтагазавы канфлікт з Расіяй двухгадовай даўніны. Пакуль чакалі калапсу, Лукашэнка імкліва набіраў палітычныя балы. Пасля высветлілася, што і калапсу не будзе, і пазітыўных прапановаў ад апазіцыі не дачакаліся. Зараз апазіцыя мусіць пераступіць праз спакусу спаўзці да папулісцкай рыторыкі і прапанаваць і ўраду, і грамадству грунтоўную праграму выхаду з крызісу. І можа яна зрабіць гэта з простай прычыны — тое, пра што апазіцыя казала столькі гадоў, пачынае спраўджвацца. А менавіта — што Беларусь не вытрымае бясконца без рэформаў. Што аб'ектыўныя законы эканомікі дзейнічаюць паўсюль, у тым ліку і ў нашай краіне. Што ніякай унікальнай «беларускай мадэлі» няма. Што шлях да дабрабыту ляжыць праз рынкавыя рэформы. Што Беларусь мусіць інтэгравацца ў сусветную эканоміку і стаць у ёй канкурэнтаздольнай. Такім чынам, што зараз можа апазіцыя прапанаваць ураду і грамадству?

Эканамічная будучыня Беларусі наўпрост залежыць ад таго, наколькі наладжаныя кантакты з навакольным светам і ў першую чаргу (зважаючы на эканамічны стан Расіі) з Захадам. Апазіцыя можа данесці да людзей, што ў кароткатэрміновай перспектыве, зважаючы на неабходнасць новых крэдытаў, краіна мусіць нармалізаваць палітычныя адносіны з Захадам і выйсці з міжнароднай ізаляцыі. Іншымі словамі, ад лёсу палітычнай лібералізацыі ў краіне сёння залежаць дабрабыт, заробкі і пенсіі грамадзянаў. А значыць, патрабаваць гэтай лібералізацыі трэба больш упарта і настойліва.

Другое. Апазіцыя можа запатрабаваць поўнай справаздачы ад ураду за стан нацыянальных фінансаў, зрабіць аўдыт дзяржаўных выдаткаў і патрабаваць устрымацца ад непатрэбных і сумнеўных інвестыцыйных праектаў.

Трэцяе. Апазіцыя можа і мусіць прапанаваць праграмы структурных рэформаў, накіраваныя на ўмацаванне рынкавай інфраструктуры і жыццёва важных сацыяльных паслугаў.

Чацвертае. Апазіцыя можа і мусіць запатрабаваць, каб у Беларусі неадкладна пачалася рэформа энергетычнага сектару, зацягванне з якой ставіць пад пагрозу нацыянальную канкурэнтаздольнасць і фінансавую стабільнасць.

Пятае. Апазіцыя можа і мусіць заклікаць ЕС і ЗША аказаць Беларусі тэхнічную і фінансавую дапамогу ў абмен, вядома ж, на рэформы і лібералізацыю. Пытанне пра дарожную карту яшчэ больш уваходзіць на парадак дня.

Шостае, і самае галоўнае. Апазіцыя можа і мусіць змяніцца сама. Пачаць разумець, што сітуацыя склалася так, што актарам пераменаў у Беларусі сёння з'яўляецца хутчэй улада, а не апазіцыя, і што вінаваціць апошняя за гэта можа толькі самую сябе. Узгадаць, чаго яна першапачаткова пасварылася з Лукашэнкам і адмовіцца ад логікі «чым горш, тым лепш», адмовіцца ад катэгарычнага непрымання ўсяго, што можа рабіць улада, пачаць хаця б рэагаваць на падзеі, пачаць думаць пра інтарэсы краіны спярша, а пра палітычныя расклады потым.

# Што ў Мінску дазволена, тое забаронена ў Глыбокім

**Рэдактар незалежнай газеты «Вольнае Глыбокае» ад верасня чакае адказу ад глыбоцкай пошты.**

Рэдактар і выдавец незалежнага тыднёвіка «Вольнае Глыбокае» Уладзімір Скрабатун яшчэ пры канцы верасня напісаў заяву на імя начальніка глыбоцкага вузла сувязі з просьбай разгледзець магчымасць вяртання выдання ў дзяржаўную сістэму распаўсюду. «Адказу дагэтуль няма», — кажа выдавец.

У тэлефоннай гутарцы начальнік глыбоцкай пошты паведаміў, што асабіста не супраць афармлення падпіскі на «ВГ» праз «Белпошту», бо раней дамова з рэдакцыяй прыносіла мясцовай філіі пошты неблагі прыбытак. Але, са словаў У. Скрабатуна, начальнік глыбоцкай «Белпошты» адмаўляецца вырашаць гэтае пытанне, спасылаючыся на тое, што не мае на гэта паўнамоцтваў. «Звяртацца ў абласное аддзяленне не бачу сэнсу, бо мне там наўпрост заявілі, што не пацерпяць у сябе апазіцыйнай газеты», — кажа выдавец. Што ў Мінску дазволена, тое не дазволена ў Глыбокім, дадае ён.

Газета «Вольнае Глыбокае» — без перабольшвання сямейнае прадпрыемства. Над выданнем і распаўсюдам працуе сам рэдактар, а таксама ягоныя родныя — жонка і дочкі. «Прадаем газету ўдваіх з жонкай на рынку. Таксама некалькі крамаў нас бяруць. А таксама распаўсюджваем праз рэдакцыйную падпіску». Паводле прэзідэнцкага ўказу У. Скрабатун не можа наймаць на працу старонніх людзей. З гэтай прычыны пад пытаннем застаецца развіццё рэгіянальнай карэспандэнцкай сеткі.

На сёння наклад адзінай незалежнай на Глыбоччыне газеты складае 2000 асобнікаў. Далейшы лёс выдання застаецца пад пытаннем. З матэрыяламі газеты, а таксама штодзённымі навінамі рэгіёну можна азнаёміцца на сайце Westki.info.

Нагадаем, што ад пачатку 2006 году газета «Вольнае Глыбокае» разам з двума дзесяткамі недзяржаўных выданняў была выключаная з сістэмы дзяржаўнага распаўсюду праз «Белпошту» і «Белсаюздрук».

**Сямён Печанко**

# Хто купіў і хто прадаў $417 млн па старым курсе перад самым абвалам?

23 снежня 2008 году прапанова даляраў ЗША на Беларускай валютна-фондавай біржы склала $506,262 млн. Гэта незвычайна шмат. Нашмат больш за звычайныя паказчыкі. Яна перавышала попыт ($88,924 млн) у 6 разоў.

Каб вы параўналі, вось якія паказчыкі попыту і прапановы назіраліся ў іншыя дні апошніх тыдняў:

| Дата | прапанова | попыт |
|---|---|---|
| 5.01 | 37,95 | 57,16 |
| 24.12 | 314,72 | 321,26 |
| 23.12 | 506,26 | 88,92 |
| 22.12 | 80,27 | 107,09 |
| 19.12 | 63,34 | 83,58 |
| 18.12 | 59,16 | 93,09 |
| 17.12 | 47,04 | 102,39 |
| 16.12 | 47,56 | 71,7 |

Як бачым, 23 снежня — адзіны такі дзень, калі прапанова нашмат перавышала попыт (прычым толькі па далярах), і, тым не менш, насуперак логіцы, гэта не прывяло да зніжэння курсу. Узнікае інтрыгоўнае пытанне, хто прадаў і хто купіў аж $417 млн непасрэдна перад абвалам, тады, калі рашэнне пра дэвальвацыю, несумненна, было ўжо прынята, але трымалася ў строгай сакрэтнасці?

Днём раней прапанова на даляры была амаль на 30 млн меншай за попыт — каля $80 млн супраць — $107 млн. 24 снежня, у апошні дзень таргоў, прапанова зноў была меншай за попыт — $314,7 млн супраць $321,3 млн.

Дарэчы, гэты разрыў між попытам на валюту і прапановай і прыводзіў да падзення золатавалютных запасаў краіны. Нацбанку прыходзілася прадаваць уласныя запасы валюты, каб задаволіць попыт прадпрыемстваў.

Лічбы, зафіксаваныя на таргах БВФБ 23 снежня, справакавалі ўсялякія чуткі і спекуляцыі. Маўляў, пэўныя асобы і арганізацыі на тым зарабілі. «НН» звярнулася да БВФБ і Нацбанку з просьбай растлумачыць сітуацыю.

Начальнік упраўлення інфармацыі Нацбанку Анатоль Драздоў расказаў, што ў выпадку, калі ў часе гандлю замежнымі валютамі на БВФБ прапанова перавышае попыт, рэшту набывае Нацбанк, а не якія там прыватныя асобы. З яго словаў, нічога экстраардынарнага ў выніках таргоў 23 снежня няма: былі затрымкі ў плацяжах, бо шмат хто з пастаўшчыкоў, зважаючы на фінансавы крызіс, прасіў адтэрміноўкі, акрамя ўсяго — канец году, калі суб'екты гаспадарання прадаюць валюту.

Такім чынам, скупіў Нацбанк. А хто ж прадаў, лічы, па нявыгадным курсе?

Намеснік старшыні праўлення БВФБ Сяргей Ціннікаў супакойвае, што рэзкі рост прапановы даляраў ЗША ў часе гандлю замежнымі валютамі — гэта сезонная з'ява. «Няма тут ніякага сакрэту, бо мы яшчэ за два тыдні да гэтага паведамілі пра апошнія тэрміны гандлю валютамі. І такі ўсплёск у перадапошні дзень таргоў цалкам натуральны». Адказваючы на пытанне пра магчымасць нейкіх маніпуляцый перад дэвальвацыяй, С.Ціннікаў адзначыў, што ўсталяваныя на БВФБ правілы цалкам выключаюць гэта. З яго словаў, калі нехта дасведчаны захацеў бы скарыстацца з сітуацыі, то зрабіць гэта было б працей праз Міжбанкаўскую валютную біржу. Праз Міжбанк праходзяць у разы большыя аб'ёмы валюты, падкрэсліў намеснік старшыні праўлення БВФБ.

Аднак тлумачэнне сп.Ціннікава не здымае пытанняў: так, 24 снежня, у апошні дзень перад перапынкам у дзейнасці БВФБ, аб'ёмы таргоў сапраўды былі павялічаныя, і гэта лагічна, але таксама лагічна, што і прапанова была павышаная: камусьці трэ было прадаць, каб заплаціць заробкі з прэміяльнымі ды падаткі, а камусьці — набыць. І тое лагічна ў апошні перадкалядны дзень. Але не ў перадапошні.

Тлумачэнне ўдалося адшукаць у фінансавых колах.

Як патлумачылі нашаму карэспандэнту, шэраг буйных прадпрыемстваў-экспарцёраў вымусілі прадаць у перадапошні дзень таргоў назапашаную валюту. Курс даляра ЗША на БВФБ складаў 2200 беларускіх рублёў. Выходзіць, дзяржава зарабіла двойчы. Яна зарабіла на дэвальвацыі, у выніку якой рубель, а з ім нашы заробкі і ашчаджэнні зняцэніліся на 20%. Яна зарабіла і на экспарцёрах, якіх «ратавала» дэвальвацыяй, скупіўшы ад іх валюту прымусам па нявыгадным курсе.

Так што ніякіх спекулянтаў — дзяржаўная выгада.

**Сямён Печанко**

# Дом Ломаця ў Ракаве

Старшыня Камітэту дзяржкантролю Зянон Ломаць мае лецішча ў мястэчку Ракаў — калісь самым блізкім да Мінску пункце панскай Польшчы.

Начальнік грознай структуры, ад праверак якой паляцеў не адзін тузін галоваў чыноўнікаў, вырошчвае тут гурочкі, памідорчыкі ды бульбу. Я адправіўся пабачыць лецішча старшыні Дзяржкантролю на свае вочы.

Дом Ломаця вам пакажа кожны ў Ракаве. Яшчэ б — пасля таго, як высокі начальнік прыдбаў тут хатку гадоў пяць таму, мясцовую краму адразу ж адрамантавалі. Ракаўчукі лічаць, што гэтыя падзеі звязаныя.

Прабіраюся па снезе на ўскраіну Ракава — і на адной з вулачак перадапошні дом — якраз той, што я шукаю. Цагляны, з мансардай. Пры ім — альтанка ды фундаментальныя парнікі. Вісіць спадарожнікавая талерка. Дагледжаны плот, у двары мерзне сабачка.

А вось і чалавек. Як высвятляецца — гэта сусед Ломаця, спадар Віктар. Ён прадпрымальнік, робіць намагільныя помнікі. Пра высокага суседа распавядае ахвотна: «Вельмі добры чалавек. Просты такі, пазітыўны».

Хата, якую прыдбаў Ломаць, збудаваная ў 1988 годзе. Віктар прыгадвае яе гісторыю: «Прадаў яе чалавек з чарнобыльскай зоны. Ён збудаваў яе калісьці, пажыў, а пасля нечага вырашыў пераехаць».

Віктар кажа, што не ведае, за колькі Ломаць набыў гэты дом.

Нечаканасцю для мяне стала тое, што старшыня Дзяржкантролю не грэбуе сам пакорпацца ў градах. Ломаці поўнасцю гадуюць усё сваё! Памідоры, гуркі, бульбу раннюю і звычайную. Працуюць ад вясны да восені. Летам увогуле практычна жывуць тут, узімку прыязджаюць часам... Зболышага жонка ягоная ў градах ды на агародзе працуе — Любоў Мікалаеўна.

Віктар ведае, што дачок Ломаця завуць Алена і Вераніка. І кажа, што зяць Ломаця, якога пасадзілі — гэта муж Алены. Нагадаем, маёр Алег Рашчэня ўжо доўгі час знаходзіцца ў СІЗА, яго абвінавачваюць у «незаконнай прадпрымальніцкай дзейнасці, якую здзяйсняла арганізаваная група». Максімальны тэрмін па гэтым артыкуле — 9 гадоў.

Віктар уздыхае і кажа, што сам Ломаць — выключна шчыры і сумленны чалавек. У прыклад прыводзіць ягоную машыну — далёка не новы «Форд».

На суседняй вуліцы дзве бабулькі распавядаюць, як жонка Ломаця ходзіць з імі разам у царкву: «Да споведзі прыходзіць з сям'ёй».

Іншая суседка Зянона Ломаця на просьбу старшыні Камітэту дзяржкантролю ходзіць карміць ягонага сабачку, які ахоўвае хату. Ад каментароў жанчына ўстрымліваецца, а толькі голасна пачынае лямантаваць, чаму я фатаграфую хату без дазволу, і пагражае выклікаць міліцыю.

**Арцём Багданаў, Польскае радыё для замежжа**



**Зянон Ломаць мае добры інвестыцыйны нюх. Пяць гадоў таму такая сядзіба ў Ракаве магла каштаваць каля 30—40 тысяч даляраў. Да крызісу цана на падобныя сядзібы ўзрасла да 150—200 тысяч. Нерухомасць у Ракаве моцна пайшла ўгару ў цане пасля таго як у мястэчка правялі газ. Цяпер многія жыхары сталіцы пераехалі туды на жыхарства.**



# Працоўная дынастыя Макеяў

Дзяржаўныя СМІ любяць расказваць пра працоўныя дынастыі трактарыстаў, даярак, настаўнікаў.

Своеасаблівыя працоўныя дынастыі складваюцца і на сталічным узроўні. Многія дзеці беларускіх чыноўнікаў робяць бліскучыя дыпламатычныя кар'еры. Яшчэ адзін прыклад з гэтай серыі — сын кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта Уладзіміра Макея Віталь. Ён працуе першым сакратаром пасольства Беларусі ў Аўстрыі.

Паводле нашай інфармацыі, Макей-малодшы прыйшоў у цэнтральны апарат МЗС амаль адразу па сканчэнні універсітэту. Некалькі гадоў займаўся пытаннямі раззбраення і кантролю над узбраеннямі. Пасля чаго атрымаў накіраванне за мяжу.

У Вене Віталь Макей адказвае за пытанні навукі і адукацыі, а таксама за адносіны з МАГАТЭ — апошні кірунак набыў новае значэнне праз рашэнне пабудаваць беларускую АЭС недалёка ад Нарачы.

Нагадаем, што сын былога кіраўніка КДБ Сцяпана Сухарэнкі Андрэй працуе першым сакратаром пасольства Беларусі ў Францыі, а сын міністра ўнутраных справаў Уладзіміра Навумава Захар — першым сакратаром пастаяннага прадстаўніцтва пры аддзяленні ААН у Жэневе.



**Віталь Макей.**

Пры розных пасадах у МЗС знайшлі сябе нашчадкі Леаніда Ерына, Сяргея Лінга, Ігара Заламая, Уладзіміра Рыжанкова, Васіля Шаладонава. Пачынаў свой працоўны шлях у беларускім пасольстве ў Германіі і старшы сын Аляксандра Лукашэнкі — Віктар.

**Зміцер Панкавец**

# Групавое самагубства на пагранзаставе

Два салдаты павесіліся ў пушчы.

Канец 2008 году стаўся для Свіслацкага раёну надзвычай непрыемным. Нечакана два салдаты з мясцовай памежнай заставы ўцяклі і павесіліся ў пушчы. Гэта найрадчэйшы выпадак групавога самагубства ў беларускім войску.

У вайсковай пракуратуры памежных войскаў акалічнасці трагедыі на Свіслацкай памежнай заставе пракаментаваць адмовіліся, параіўшы напісаць пісьмовы запыт.

Пэўную інфармацыю ўдалося атрымаць ад мясцовых жыхароў. Расказваюць, што, нібыта, тыя двое прымушалі малодшага па тэрміне службы салдата выканаць за іх заданне. «Малады» загад не выканаў. Атрымаўшы кухталёў, паскардзіўся камандзірам. У выніку на заставу завіталі следчыя. Паводле чутак, вінаватых, якім да звальнення засталося два тыдні, добра пужнулі, прыгразіўшы дысбатам. І тыя не вытрымалі. Мясцовыя кажуць, што смерць двух салдатаў у літаральным сэнсе ўскалыхнула заставу. Лёс яе камандзіраў цяпер няпэўны.

**Сямён Печанко**

# Чыстыя штаны

Першаіерарх Аўтакефальнай праваслаўнай царквы ў Польшчы быў агентам камуністычнай спецслужбы.

Матэрыялы пра гэта мае апублікаваць польскі Інстытут нацыянальнай памяці. Гэта навуковая ўстанова, якая разбірае архівы СБ — аналага савецкага КГБ. Напярэдадні публікацыі мітрапаліт Сава даў інтэрв'ю журналістам «Газеты выборчай». З яго вынікае сумны вобраз Царквы, якая цалкам кантралявалася спецслужбамі і нават не спрабуе з-пад таго кантролю вызваліцца.

Мітрапаліт Сава (Міхал Грыцуняк), першаіерарх Аўтакефальнай праваслаўнай царквы ў Польшчы, прафесар тэалогіі, генерал брыгады Войска Польскага (праваслаўны капелан войска да 1998 году), кавалер Камандорскага Крыжа Адраджэння Польшчы і прочая і прочая, ад 1966 году быў зарэгістраваны польскім СБ як агент «Юрэк». Завербавалі яго, шантажуючы тым, што нібыта маюць на яго кампраметуючыя дакументы. Хоць нічога яму не паказалі.

З архіўных папераў вынікае, што ў адной з гутарак ён даваў характарыстыкі праваслаўным япіскапам, спыняючыся на іх слабасцях. У другой размове ён пераказваў чуткі пра сексуальныя адхіленні некаторых святароў. Сам ён адмаўляе, што такое гаварыў. З ягоных словаў, размовы былі пра агульную сітуацыю, пра настроі.

Праваслаўная царква ў Польшчы мела тады праблемы з вышэйшымі іерархамі: япіскап мусіў адначасова і быць манахам, і мець вышэйшую адукацыю. Такіх асобаў было мала. Дзеля таго папярэдніка мітр. Савы на пасадзе — мітр. Васіля, спецыяльна развялі з жонкай. Гэткія моманты жыва цікавілі СБ.

Паводле словаў мітрапаліта, згоды на супрацоўніцтва ён не падпісваў, падпісаў толькі «прысягу на вернасць Польскай Народнай Рэспубліцы». Прычым такую прысягу, кажа ён, падпісалі ўсе праваслаўныя япіскапы. Аднак ён прызнае, што хутка зразумеў: СБ разглядае яго як свайго агента. Архіўныя дакументы сведчаць пра іншае: будучы мітрапаліт стаў тайным супрацоўнікам СБ добраахвотна.



З архіваў паўстае сумны вобраз Царквы пад кантролем спецслужбаў.

**Мітрапаліт Сава** (Міхал Грыцуняк)
нар. у 1938 на Холмшчыне. Этнічны ўкраінец.

Мітрапаліт тлумачыць, што падтрымліваў кантакты з СБ для дабра Царквы. Маўляў, час быў такі, і іншага выйсця не было. «Я не зрабіў нічога кепскага для Айчыны, Царквы і каго-кольвек», — цвердзіць мітрапаліт.

За сваю «працу» ён атрымліваў грошы, але гэта была звыклая практыка: іх атрымлівалі ўсе праваслаўныя япіскапы і называлася гэта «матэрыяльнай дапамогай». Грошы выдаваліся ў Аддзеле па справах рэлігій.

Адкрыццё архіваў выявіла, што агентамі спецслужбаў былі і кіраўнікі праваслаўных іерархій у Літве і Румыніі. Можна меркаваць, што аналагічная ступень кантролю ўладаў над Царквой была і ў іншых сацыялістычных рэспубліках. Але там архівы яшчэ закрытыя.

Сачэнне было татальным. «Яны [польскае ГБ] скіравалі мяне ў Загорск [расійская праваслаўная акадэмія ў Тройца-Сергіевай лаўры] недзе ў 1978—1979 годзе. Гэта адбылося ў мэтах навучання мяне дысцыпліне. Адтуль я запомніў адну сітуацыю. Я харчаваўся разам з прафесарамі. Я быў ужо кандыдатам навук і займаўся навуковай працай, пісаў доктарскую. А там увесь час кармілі нас кашай, і я пажартаваў: што гэта ў вас усё каша ды каша. Калі я вярнуўся ў Польшчу, сустрэў мяне мітрапаліт Васіль, дык ён ужо ведаў, што мне не спадабалася каша. Ён даведаўся аб гэтым ад польскіх СБшнікаў, а тыя — ад КГБ».

«Ці можна сказаць, што ўся расійская Царква кантралявалася КГБ? Ці адчулі вы гэтую атмасферу ў Загорску? — пытаецца ў мітрапаліта інтэрв'юер. — Так, адчуў, — прызнаецца мітрапаліт. — Калі я тады быў у Загорску, мной апекаваўся спецыяльны чалавек. Гэты чалавек павінен быў ведаць усё. То быў адзін са студэнтаў. Ён хадзіў за мною ценем».

З пачуцця далікатнасці газета даручыла весці інтэрв'ю разам з журналісткай выдання віднаму каталіцкаму тэолагу айцу Яну Турнаў. Айцец Турнаў вядомы тым, што дапамагаў вярнуць манастыр у Супраслі праваслаўным.

У Каталіцкім касцёле створана спецыяльная камісія, што вывучае супрацоўніцтва духоўных асобаў з СБ, і адбыўся вялікі скандал, калі выявілася, што новапрызначаны арцыбіскуп Варшаўскі быў агентам; ён мусіў падаць у адстаўку. У Праваслаўнай царкве таго няма. Люстрацыю мітрапаліт лічыць злом. «Калі я быў малады і гарлівы, я лічыў, што калі нехта правініўся, трэба яго пакараць. Але памятаю, як адзін з старых япіскапаў сказаў мне: «Браце, глядзі, каб твае штаны былі чыстыя». Мы вырашылі, што ў чужых грахах калупацца не будзем, кожны сам будзе адказваць перад Богам».

«КГБ супрацоўнічала з СБ у мэтах знішчэння Царквы, — кажа мітр. Сава.— Трэ было выбіраць: або глядзім рэалістычна, ідзем на пэўны кампраміс і падтрымліваем жыццё Царквы, або пагаджаемся на яе паступовае знішчэнне. Натуральна, у часе тых размоваў у мяне магло нешта вырвацца, можа, і якое лішняе слова сказаў. Калі камусьці нашкодзіў тым, перапрашаю. Гэта цяпер здаецца простым, а тады простым не здавалася», — кажа мітр. Сава.

**Мікола Бугай**

# Наваполацкі бізнесмен Захараў арыштаваны?

Ёсць інфармацыя, што пры вобшуку ў бізнесмена было знойдзена 900 тысяч даляраў і 600 тысяч еўра.

Паводле інфармацыі «Беларускага партызана», 29 снежня быў арыштаваны скандальна вядомы наваполацкі прадпрымальнік Уладзімір Захараў.

Нагадаем, 22 і 23 снежня ў Наваполацку не працавалі гандлёвыя дамы «Стралецкі рынак», «Еўралюкс» і «Капітал», якія належаць Захараву. Уладальнік тады растлумачыў гэта тым, што «не бачыць сэнсу працы ў такіх жорсткіх умовах, якія яшчэ горш узмацняюцца ў Беларусі».

Прадпрымальнікі, якія арандавалі ў Захарава памяшканні, пазбавіліся праз гэта вялікіх даходаў і нават рыхтавалі калектыўны зварот у Гаспадарчы суд.

«Ён ні з кім не ідзе на кантакт, яго ніхто не можа знайсці! Ён гаворыць, што яму надакучылі праверкі», — казаў у тыя дні адзін з наваполацкіх прадпрымальнікаў.

«Партызан» перадае, што той бунт мог быць звязаны з тым, што Захараў ужо ведаў, што супраць яго заведзеная крымінальная справа. Сайт паведамляе, што пры вобшуку ў бізнесмена было знойдзена 900 тысяч даляраў і 600 тысяч еўра.

Цяпер ён нібыта знаходзіцца ў ізалятары на Валадарскага.

Намеснік начальніка прэс-службы МУС Алег Слепчанка не змог ні абвергнуць, ні пацвердзіць гэтую інфармацыю.

Уладзімір Захараў — адзін з найболып уплывовых людзей Наваполацку. Нярэдка ён крытыкаваў мясцовыя ўлады. Апроч гандлёвых цэнтраў ён валодае газетай «Інформ-Плюс», а таксама тэлеканалам «Квант» і шмат чым яшчэ ў горадзе. Цяпер усяго гэта Захараў можа пазбавіцца.

**ЗП**


МІКАЛАЙ РЫБАКОЎ

**Амбулаторыя ў Копысі, у якой нарадзіўся А.Лукашэнка. Да 2004 мела сярэднестатыстычны выгляд, цяпер — бачыце самі. З шыльдай, ого-го.**

## Шаноўны Пракаповіч, паглядзіце на 20 рублёў!

**20 рублёў — але ж гэта меней за адзін амерыканскі цэнт.** А ці магчыма ў Беларусі набыць штосьці на 20 рублёў? Нічога. Карабок запалак каштуе 40 рублёў. Бачыў карціну — падышоў бомж да выкінутай бутэлькі, валяліся 20 рублёў, падняў пустую бутэльку, а грошы так і засталіся валяцца.

Шаноўны Пракаповіч, паглядзіце на гэтую банкноту — 20 рублёў — там намаляваны Нацыянальны банк. Іншы паглядзіць, што на «Нацыянальны банк» нічога не купіш, ды мяняе беларускія рублі на еўра, даляры. Так выказвае недавер да ўлады.

Падчас крызісу 1998 г. у Паўднёвай Карэі грамадзяне панеслі даляры і золата ў банкі. Нават стаялі ў чэргах. Чаму? Адказ на паверхні — давер да ўлады. А гэта каштуе больш за ўсё. 2,5 мільёны працоўных, прынясіце з «панчохі» па 100 даляраў. Вось вам і 2,5 мільярды даляраў. Не патрэбен быў бы крэдыт ні Расіі, ні Валютнага фонду.

**Мікалай Рыбакоў, Копысь (Аршанскі раён)**

## Ягайла — не наш герой

**У паведамленні «НН» (№46’2008) пра спрэчкі вакол помніка ў гонар**

Магдэбургскім правам Ягайла хацеў перакупіць Берасце.

**1000-годдзя Брэста няма абароны беларускіх інтарэсаў.** Вось, маўляў, які непарадак, Філарэт супраць фігуры Ягайлы. А ён жа даў Брэсту магдэбургскае права! Але трэба ведаць, пры якіх абставінах. У той час ішла барацьба паміж Вітаўтам і Ягайлам, які, застаючыся вялікім князем літоўскім, стаў яшчэ польскім каралём і пачаў абараняць польскія інтарэсы. Вітаўт змагаўся за палітычныя правы ВКЛ — беларуска-літоўскай дзяржавы. ВКЛ бунтавала супраць Ягайлы, і ён асцерагаўся, што зусім страціць кантроль, і вырашыў перавесці пад сваю ўладу (фактычна — далучыць да Польшчы) беларускія гарады па адным. Пачаў з Берасця. Каб выклікаць у берасцейцаў прыхільнасць да сябе, даў гораду магдэбургскае права. Фактычна гэта была спроба «купіць» берасцейцаў. Але прапольска-праягайлаўская партыя ў горадзе так і не зладзілася, Берасце засталося верным ВКЛ і Вітаўту. Але магдэбургскага права Вітаўт, вядома, не адмяняў. Так Берасце стаў першым з беларускіх гарадоў, які атрымаў магдэбургскае права.

Ды і ў агульнабеларускім рэчышчы Ягайла — не той гістарычны дзеяч, якому ў Беларусі трэба ставіць помнікі. Крэўская унія з Польшчай — несумненная здрада Ягайлы. Пасля яе інтарэсы Польшчы былі пастаўленыя вышэй за інтарэсы Вялікага Княства Літоўскага.

**Тацяна Шаклач, Мінск**

**Ад Рэдакцыі.** Няма несупярэчлівых гістарычных асобаў. Калі гаворым пра Ягайлу, мусім памятаць, што пры ім працягнулася хрысціянізацыя краіны, супольна з Вітаўтам ён спыніў замежную агрэсію, паклаў край міжусобным войнам у ВКЛ. Быў дзяржаўным дзеячам еўрапейскага маштабу і заснавальнікам беларуска-польскай каралеўскай дынастыі.

## Замест АЭС — фермерскія гаспадаркі

**Пабудова атамнай электрастанцыі — памылковы крок.**

Згубны палітычны, бо стане яшчэ большая залежнасць ад Расіі (будаваць АЭС збіраецца яна). Згубны эканамічна, бо АЭС ніколі сябе не акупіць. Цяжар доўгу павісне ня плячах нашых дзяцей. Згубны сацыяльна, бо набудзем вечную трывогу. А дзе трывога, там сапсаваныя нервы і здароўе.

Папрасіўшы грошы ў развітых краінаў, нам патрэбна патраціць іх не на згубную справу, а

Крэдыты не на гігантаў, а на сямейны бізнес.

на жыццёвую — інвестыцыі ў стварэнне фермерскіх сямейных гаспадарак, якія вырашаць галоўныя праблемы — харчовую і дэмаграфічную.

**Вячаслаў Сухарэбскі, в.Русіны (Баранавіцкі раён)**

# Конкурс «Беларускі Настаўнік–2009»

Рэспубліканскае грамадскае аб’яднанне «Таварыства беларускай школы» абвяшчае традыцыйны конкурс «Беларускі настаўнік году». У ім могуць узяць удзел педагогі ўсіх тыпаў адукацыйных і выхаваўчых установаў (ад дашкольных да каледжаў), акрамя ВНУ, са стажам працы не менш за тры гады. На кандыдата конкурсу запаўняецца анкета рэкамендуючай арганізацыі, установы або самім педагогам (бланк анкеты ёсць на сайце http://nastaunik.info) і дасылаецца да 1 сакавіка 2009 г. на адзін адрас: 220051 Мінск, вул.Громава, 38–21. Лозку А.Ю; або на электронную пошту: tbskoly@tut.by. Могуць дадавацца іншыя матэрыялы, што пацвярджаюць высокія вартасці кандыдата. Пры неабходнасці журы ТБШ можа наведаць установу канкурсанта.

Даведкі: http://nastaunik.info, (029) 752–08–21.

**Задачы** конкурсу:

· маральная падтрымка беларускамоўных педагогаў адукацыйных установаў;
· прыцягненне ўвагі грамадскасці да праблем роднамоўнага выкладання і выхавання ў базавых і сярэдніх школах, дашкольных і пазашкольных установах, ліцэях, гімназіях і каледжах;
· фарміраванне грамадскай думкі аб прэстыжнасці навучання па-беларуску;
· аб’яднанне беларускамоўных педагогаў, спрыянне іх супрацоўніцтву, абмену досведам працы, арганізацыі супольных праектаў і інш.

**Крытэры** вызначэння пераможцаў конкурсу:

· выкладанне па-беларуску дысцыпліны ці правядзенне выхаваўчай працы на роднай мове;
· прафесіяналізм і наватарства, творчасць і навуковасць;
· аўтарытэт сярод калег, бацькоўскай грамадскасці і навучэнцаў;
· высокая грамадзянская пазіцыя.

Усе дастойныя кандыдаты будуць адзначаныя дыпломамі ТБШ, асобна будуць ганараваныя тры пераможцы-лаўрэаты ў красавіку 2009 г.

Рэспубліканскае грамадскае аб’яднанне «Таварыства беларускай школы» (ТБШ) летась правяло конкурс **«Беларускі Настаўнік 2008 году Мінску і Мінскай вобласці».** Пераможцамі яго сталі: Юрый Бандарэнка, выдатнік адукацыі БССР, СССР, фізік, дырэктар Мінскай беларускай нацыянальнай гімназіі №4; Уладзімір Мартысюк, заслужаны настаўнік Беларусі і РФ, матэматык СШ №168 г.Мінска; Міхась Тычына, доктар філалагічных навук, прафесар, выкладчык зачыненага Гуманітарнага ліцэю імя Якуба Коласа; Наталля Ільініч, настаўніца гісторыі, айчыннай і сусветнай мастацкай культуры Талькаўскай СШ Пухавіцкага раёну; Галіна Дрокіна, выкладчык геаграфіі і эканомікі гімназіі №10 г.Маладзечна; Антаніна Абрамовіч, намеснік дырэктара па этнакласах Мётчанскай СШ-саду Барысаўскага раёну.

«НН» з радасцю друкуе ў газеце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаванні. З прычыны вялікага аб’ёму пошты мы не можам пацвярджаць атрыманне Вашых лістоў, не можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас: а/с 537, 220050 Мінск.**
**e-mail: nn@nn.by. Факс: (017) 284-73-29**

# Быць беларусам у Расіі

Піша **Алесь Чайчыц** з Масквы.




Заставацца сабою — гэта значыць вылучацца нечым сярод іншых людзей, адрознівацца ад усіх астатніх, бо ты — гэта ты, а не нехта іншы. Людзі маюць розныя колеры скуры, валасоў і вачэй, розны рост і камплекцыю. Людзі вераць ці не вераць у Бога, галасуюць за розныя палітычныя партыі на выбарах, маюць розныя кулінарныя і музычныя густы, апранаюць розную вопратку.

Нацыянальная ідэнтычнасць — натуральны складнік ідэнтычнасці чалавека, яго пазіцыянаванне ў сістэме каардынатаў грамадства паводле яшчэ адной прыкметы. Асабліва гэта актуальна для вялікай шматнацыянальнай краіны як Расія, якая ёсць домам для людзей з больш як 150 этнасаў — у тым ліку і для нас, расійскіх беларусаў.

Для нас заставацца сабой — значыць у тым ліку заставацца беларусамі.

Пераважная большасць беларусаў у Расіі асімілююцца цягам першых пакаленняў. З 1989 да 2002 г. колькасць жыхароў Расіі, што ідэнтыфікавалі сябе беларусамі, упала на трацiну, з 1,2 млн да 808 тысячаў чалавек.

Часта даводзіцца назіраць людзей, што, пераехаўшы ў Маскву, пачынаюць заўзець за «нашу» расійскую зборную па футболе, абмяркоўваць, як «у нас» праходзяць выбары ў Дзяржаўную Думу. Прыкра бачыць беларускамоўных, якія пасля пераезду ў Маскву пачынаюць звяртацца да цябе парасійску.

У сучасных умовах, калі дзякуючы камунікацыйным тэхналогіям можна з любой кропкі планеты слухаць беларускае радыё, чытаць беларускую прэсу і стасавацца з беларусамі з усяго свету, гэта прыватны выбар кожнага чалавека: асіміляваца ці не. Даводзілася чуць, што ў сучасным глабалізаваным свеце асіміляваца — гэта натуральна і непазбежна.

Хочацца не пагадзіцца.

Хтосьці кажа, што глабалізацыя — гэта пераплаўленне ўсіх моваў і народаў у адно і гублянне ідэнтычнасці, а я скажу, што ў глабальным свеце індывідуальнасць, наадварот, выходзіць на першы план.

Любая адрознасць — гэта патэнцыйная перавага. Калі ты не маеш адметнасці, табе няма чаго прад’явіць гэтаму свету. Тое, што не зяўляецца ўнікальным — не нясе інавацыйнасці, таму не мае вартасці. Гэта адносіцца і да ідэй, але ў першую чаргу да іх носьбітаў і генератараў — людзей, а таксама да створанага імі асяродку, дзе ідэі нараджаюцца.

Ніколі не будзе такога, каб усе людзі думалі і паводзілі сябе аднолькава — а значыць, і нацыянальна-культурная ідэнтычнасць ніколі не будзе замененая на нешта іншае.

Асабіста я зрабіў выбар на карысць таго, каб не асіміляваца, не адмаўляцца ад беларускіх каранёў. Я не хачу быць ані тым распаўсюджаным тыпам расійца, што забыў свае татарскія, мардоўскія ці ўкраінскія карані, ані тым тыповым расійскім беларусам, што выракся беларускасці.

Заставацца беларусам на фоне расійскай масы — гэта пэўны складнік адметнасці, частка таго індывідуальнага, што я не хачу прыносіць у ахвяру супольнасці. Хтосьці назаве гэта супрацьстаўленнем сябе грамадству — а я назаву гэта, наадварот, знаходжаннем і ўсведамленнем свайго месца ў ім, сярод гэтых 140 мільёнаў людзей розных нацыянальнасцяў, моваў, рэлігіяў.

Быць беларусам — гэта быць грамадзянінам, быць асобаю. Быць самастойнай і ў той самы момант арганічнай часткай бязмежнага сучаснага свету і часткай вялікай гісторыі чалавечай расы. Гэта быць і заставацца самім сабою.

**Апублікавана ў маскоўскім беларускім альманаху «Скарыніч», №7**

# Альгерд Бахарэвіч: «Сарока на шыбеніцы» — гэта падарожжа па целе адной маладой жанчыны

Пісьменнік Альгерд Бахарэвіч стала жыве ў Гамбургу (Германія) і кантактуе з Бацькаўшчынай кнігамі: «Ніякай літасці Валянціне Г.», «Праклятыя госці сталіцы», і вось нядаўна — «Сарока на шыбеніцы». З пісьменнікам гутарыць карэспандэнт «НН» **Павал Касцюкевіч**.

**«НН»: Як Вам заснежаны Мінск?**

**АБ:** Гадзіннік у сталовай насупраць КДБ усё так жа не працуе і паказвае той самы час, што і да майго ад'езду. А ў астатнім... У горадзе прыкметна пабольшала еўрапейскасці, і ад яе спалучэння з невынішчальнай мінскай савецкасцю цяпер утварылася абсалютна пачварная і надзвычай эстэтычна цікавая сумесь. Я нідзе не бачыў гарадоў, падобных да Мінску.

**«НН»: Чыста па-людску: дадому, у Беларусь, не хочацца?**

**АБ:** Мая Беларусь і так заўжды са мной. А іншыя спачатку хай давядуць мне сваё права так называцца.

**«НН»: Беларусь — гэта...**

**АБ:** Беларусь — гэта кніга, якую я ніколі не змагу напісаць.

**«НН»: Значыць, пісьменнік усё ж мае права на аб'ектыўную абыякавасць, на выкшталцонае назіранне, і таму браць на сябе адказнасць за станаўленне нацыі (тоеснасці, мовы і г.д.) не павінен?**

**АБ:** Адзінае, што павінен рабіць пісьменнік, — гэта пісаць цікавыя кнігі і не карыстацца ісцінамі, узятымі на пракат. Адказнасць за нацыю я пакідаю розным пракрокам-аматарам, экстрасэнсам ад палітыкі, літаратурным вегетарыянцам і юным фюрэрам. Я не ўяўляю сабе, наколькі завышаную самаацэнку трэба мець літаратару, каб сказаць: «Ідзіце ўсе за мной! Я ведаю правільны шлях!». Пісьменнік — гэта ўсяго толькі пісьменнік, чалавек слабы і часта заганны; адзінае, чым ён адрозніваецца ад іншых — ягоная здольнасць да чараўніцтва, ягонае ўменне расстаўляць словы так, каб гэта хацелася чытаць. На мой погляд, за вялікімі задачамі губляецца галоўнае — мастацтва; багоў, якім служыць пісьменнік, завуць не Радзіма і не Народ, а Творчасць і Талент. Не кажыце мне, што гэтыя паняткі нельга супрацьпастаўляць: адна з галоўных умоваў сапраўднай літаратуры — адчужанасць, самота, самадастатковасць, а радзіма і народ так ці інакш азначаюць прывязанасць, згуртаванасць, еднасць. Літаратура — рэч інтымная, а ці можа быць інтымным, напрыклад, патрыятызм?

Радзіма і народ — гэта наогул занадта абстрактна. Іх часта бяруць у суаўтары, але выключна са страху не справіцца самому, са страху ўласнае пустаты і дзеля яе апраўдання. Пры ўсім гэтым я нічога не маю супраць радзімы: я пішу, гавару і думаю па-беларуску — што яшчэ можа зрабіць для цябе такі слабы чалавек, як я, о Patria? «Выкшталцонае назіранне» — гэта вельмі добра сказана, так: даваць людзям эстэтычную асалоду і па магчымасці берагчы іх ад прыступаў сваёй сумнеўнай любові.



Юлія Дарашкевіч

**«НН»: Якія суадносіны ў літаратуры з рэальнасцю? Ці вы будуеце свой свет, калі пішаце свае кнігі, ці адлюстроўваеце яго? Літаратура навыперадкі з рэальнасцю? Ці сімбіёз?**

**АБ:** Нейкай аб'ектыўнай рэальнасці насамрэч не існуе. Для п'янага чалавека слова рэальнасць будзе значыць зусім не тое, што для цвярозага; для чалавека, які носіць акуляры, яна заўжды будзе выглядаць інакш, чым для ўладальніка добрага зроку; глуханямы і сляпы, пажылы чыноўнік і нявінная дзіця, мужчына і жанчына маюць розныя рэальнасці. Давайце палічым, колькі гадзін за сваё жыццё чалавек праводзіць у сне — хіба мы бачым аднолькавыя сны? Так званая рэальнасць — гэта тое, што бярэцца для пабудовы дэкарацыяў, дый тое самых грубых. Сапраўдны пісьменнік прыдумляе амаль усё, тым ён і адрозніваецца ад публіцыста. На жаль, гэтыя віды дзейнасці многія дагэтуль схільныя блытаць. Калі пісьменнік і ёсць люстэркам, то гэта намаляванае люстэрка, кшталту агню каміну ў доме таты Карла.

Я прыдумляю ў сваіх кнігах амаль усё. А калі і бяру туды нешта з гэтай самай рэальнасці — які-небудзь змрочны будынак ці тралейбус з пасажырамі — усё адно з такімі рэчамі адбываецца потым у тэксце дзіўныя метамарфозы: тэкст сам прымушае іх змяніцца.

Мо таму і вар'яцеюць пісьменнікі, музыкі, мастакі — выправіўшыся ў падарожжа па прыдуманых рэальнасцях, яны аднойчы ўжо не могуць вярнуцца ў сваю ўласную.

> Пісьменнік не служыць ні Радзіме, ні Народу.

**«НН»: У сучаснай беларускай літаратуры (вы, Талстоў, Вежнавец) адсутнічае якасны сюжэт. Ці патрэбны ён вам? Вы ж і так абдумваеце кнігу, дык чаму сюжэту не быць абдуманым як след?**

**АБ:** Не ведаю, што маецца на ўвазе пад "якасным сюжэтам". Сюжэт мае велізарнае значэнне для дэтэктыву. Для сур'ёзнай літаратуры ён не такі ўжо і важны. Істотна не «пра што», а «як». Пісьменнік адрозніваецца ад графамана найперш наяўнасцю свайго непаўторнага голасу. Калі гэты голас (інакш: стыль) ёсць, можна весці гаворку пра што заўгодна, распавядаць любую гісторыю (ці не распавядаць яе наогул) — на свеце няма нецікавых рэчаў — літаратура ўсё зробіць сама. Самы яскравы, класічны прыклад: апісанне аднаго дня з жыцця дублінскага яўрэя Блюма стала літаратурным шэдэўрам, хаця пра сюжэт там можна казаць толькі ўмоўна. Згадаем яшчэ Роб-Грые, Елінэк, Бруна Шульца, некаторыя набокаўскія творы...

Я не адмаўляю сюжэту. Ён мусіць быць прадуманы. Аднак сутнасць і якасць тэксту вызначае не ён. Любы сюжэт непраўдападобны, але тым, хто шукае праўдападабенства, трэба чытаць газеты. Паміж чытачом і аўтарам празаічнага твору павінна заўжды існаваць негалосная канвенцыя: адгортваючы кнігу, чытач мусіць прымаць правілы гульні — паверыць на нейкі час, што так яно і было. Абавязак аўтара — усяляк спрыяць гэтаму падману. Інакш чытанне ператвараецца ў нудную працу.

**«НН»: Што любіце ў працэсе напісання найбольш: абдумванне, уласна напісанне ці прэзентацыю?**

**АБ:** Не люблю публічныя выступы, люблю адзіноту. Тут я не арыгінальны.

**«НН»: Вашы творы часта абвінавачваюць у мізантропіі. Што маеце сказаць на гэты закід?**

**АБ:** Мне блізкая пазіцыя Свіфта, які казаў, што любіць асобных людзей і ненавідзіць чалавечыя супольнасці. Я цярпець не магу ўсялякага роду чалавечыя статкі, калектывы і калектывізм: будзь тое аб'яднаная і апантаная адной ідэяй нацыя, палітычная партыя, грамадскае аб'яднанне, працоўны калектыў, вясёлае застолле, чарга ў краме, літаратурная суполка, пачакальня або набіты пасажырамі аўтобус. Там, дзе людзі яднаюцца, няхай нават выпадкова, абавязкова з'яўляецца пошласць і прыніжэнне, там нівелюецца чалавек. Ненавіджу сумесную працу і тое, што атрымліваецца ў яе выніку — як правіла, творчага там вобмаль, затое колькі навязлівасці. Чалавечыя гурты чамусьці наогул схільныя да агрэсіі. Сярод іх я задыхаюся, і мае героі адчуваюць гэта.

Героі маіх кніг — гэта людзі ў стане перманентнай асфіксіі.

**«НН»: Пра што ваша новая кніга, «Сарока на шыбеніцы»?**

**АБ:** Я здзяйсняю ў ёй падарожжа па целе адной маладой жанчыны, якую завуць Веранiка. Яна працуе ва ўправе канцлагераў і закаханая ў свайго начальніка. Я пішу пра тое, што адбывалася ў розныя часы кароткага жыцця Веранікі з яе целам, і праз гэта распавядаю гісторыю. Мы пачынаем з валасоў і потым апускаемся ўсё ніжэй, каб напрыканцы кнігі зноў вярнуцца да яе твару і зазірнуць Вераніцы ў вочы. Болей не скажу, бо, урэшце, гэта ўсяго толькі сюжэт.

**Бахарэвіч пра сваю новую кнігу**

Яе гераіню завуць Вераніка. Яна працуе ва ўправе канцлагераў і закаханая ў свайго начальніка. Я пішу пра тое, што адбывалася ў розныя часы кароткага жыцця Веранікі з яе целам, і праз гэта распавядаю гісторыю. Мы пачынаем з валасоў і потым апускаемся ўсё ніжэй, каб напрыканцы кнігі зноў вярнуцца да яе твару і зазірнуць Вераніцы ў вочы. Болей не скажу, бо, урэшце, гэта ўсяго толькі сюжэт.



# Пінігін узначаліць Купалаўскі тэатр



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Ізноў на родныя падмосткі.

Галоўны рэжысёр Купалаўскага Валеры Раеўскі заявіў, што добраахвотна саступае месца больш маладому калегу: «У мае, ужо блізкія да 70-ці, гады будзе слушным адысці ў бок, і саступіць дарогу больш маладому рэжысёру».

У Купалаўскім тэатры Мікалай Пінігін паставіў найлепшыя свае спектаклі. «Тутэйшыя» і «Ідылія» сталі культавымі і стала збіралі аншлагі. Спробы ідэолагаў зняць патрыятычных «Тутэйшых» з рэпертуару выклікалі сапраўднае масавае абурэнне.

У канцы 1990-х Пінігін змушаны быў з’ехаць працаваць у Расію, фактычна выціснуты з краіны. Яго вяртанне – чарговы знак пацяплення стаўлення ўлады да беларускай культуры.

**СМ**

**Мікалай Пінігін**

нарадзіўся 6 жніўня 1957 у горадзе Ізюм (Харкаўская вобл., Украіна).

Скончыў рэжысёрскі факультэт Беларускай акадэміі мастацтваў (1979). Працаваў на БТ (1979–1980), у 1980—1982 у Рускім драматычным тэатры ў Мінску, у 1985—1998 рэжысёрам Купалаўскага.

Паставіў «Тутэйшых» Купалы, «Ідылію» і «Пінскую шляхту» Дуніна-Марцінкевіча, Art Ясміны Рэза, «Вячэру з прыдуркам» Вэбера, «Эмігрантаў» Мрожака ды інш.

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі 1992 (за спектакль «Тутэйшыя»), у 1994 прызнаны Чалавекам году Беларусі ў намінацыі «Сцэна».

Ад 1998 працаваў у Санкт-Пецярбургу ў Вялікім драматычным тэатры імя Таўстаногава.

**КАЛЯНДАР**

## Студзень

**1** — Новы год.

**4** — 200 гадоў таму нарадзіўся Луі Брайль, вынаходнік пісьма для сляпых.

**6** — Тры Каралі ў каталікоў, Вадохрышча ва ўніятаў.

**7** — Раство ў праваслаўных.

**12** — Дзень Марціна Лютэра Кінга. У ЗША гэта дзяржаўнае свята ў гонар чарнаскурага змагара за раўнапраўе.

**19** — Вадохрышча ў праваслаўных.

**19** — 200 гадоў таму нарадзіўся Эдгар По, класік амерыканскай літаратуры.

**24** — 25 гадоў (1984) таму кампанія «Эпл» выпусціла першы персанальны кампутар «Макінтош», які выкарыстоўваў звыклы сёння графічны інтэрфейс і мыш.

**29** — 125 гадоў таму (1884) нарадзіўся Антон Луцкевіч, палітык і публіцыст, адзін з стваральнікаў Беларускай Народнай Рэспублікі, «Нашай Нівы» і Беларускай Сацыялістычнай Грамады.

**Склаў ЛК**

**ДЫСКАГРАФІЯ**

## Этна-трыо «Тройца»




Жар-жар, West Records, 2008

Ад Кірчука можна чакаць чаго хочаце.

Такой «Тройцы» даўно хацелася, каб з гітарным драйвам ды з электронікаю, але і з захаваннем фірмовай камернасці. Былі засцярогі, што «Жар-жар» паўторыць «Дарожку» — геніяльны эксперымент «Палацу», але ён проста стаў з ім упоравень. Іван Кірчук з музыкамі не ставіў за мэту збіць з ног слухача, інакш дыск яўна пачынаўся б з «Ведзьмы» ці «Казы». На пачатку «Жар-жару» нададварот гучыць тройка лагодных павольных фолк-балад, і толькі на песеньцы «На Граной нядзелі» нечакана выбухае электрагітара. Сакавітым цяжкім гукам поўніцца другая частка альбому, за выняткам хіба загалоўнага трэку — фолк-кіслотнай казкі, якую склалі самі музыкі (пэўна, першы аўтарскі твор у гісторыі «Тройцы»). Апошні цвік — «Трыпціх» — лішні раз засведчыў пра любоў этна-трыо да вялікіх формаў. Калі «Тройца» надалей заглыбіцца ў манументальнаканцэптуальную плынь — будзе нам усім фолк-рок-опера. Але ж падаецца, што ў кірунку «Жар-жару» гурт наўрад ці пойдзе. Усё гэта не больш чым эксперымент, як з нядаўдзенымі «Рунамі». Ад Кірчука можна чакаць чаго хочаце. Так што калі Іван Іванавіч раптам зачытае рэп ці заспявае пад саксафон і фартэпіяна — не дзівіцеся.

## Ядзвіга Паплаўская і Аляксандр Ціхановіч




Любовь-судьба, West Records, 2008

Яны ўжо напялілі на людскую любоў.

Дыск ад самага славутага дуэту беларускай эстрады, аснову якога склалі песні, вядомыя з дзяцінства. Што праўда, акуратна перазапісаныя з захаваннем усіх ранейшых адметнасцяў. Песні Ядзі і Сашы, як той сырадой для гарадскога — адмыслова наўрад ці спажываць будзеш, але як пакаштуеш — нібы і смачна, асабліва такія творы, як «Завіруха» ды «Счастливый случай». Гэтыя артысты з тых, каму анічога новага ствараць і не трэба — яны ўжо напялілі на людскую любоў і сталіся неад’емнай часткай беларускай музычнай сучаснасці. На дзіва добра ўклаліся ў гэты «the best-авы» канцэпт новыя песні, асабліва ўдалая «Любовь-судьба» аўтарства Ягора Хрусталёва. З сапраўдных вартасцяў — «Любви прощальный бал» трохі пад Дасэна, трохі пад «Секрет» — «Мама, не горюй» і цалкам свая «Малінаўка». Упрыгожылі артысты і «Фелічыту», нераспяваўшы яе на двух дзяржаўных мовах, а з дэкаратыўных прытанцулек «Чарка на пасашок» зрабілі натуральны тлумны фолкдэнс.

## Дрозды




Любовник-герой, West Records, 2008

Да кожнага іх трэку пасуе прыстаўка псеўда-.

На дзялянцы, якую абрабляюць «Дразды», наўрад ці ўжо нешта прарасце. Пасля ўсялякіх «лепрыконсаў», «піва ўдвух» ды іншых «параў рублей» песні ў фармаце «сапраўднага расійскага ...» (стыль падстаўляйце, які хочаце) максімум што могуць выклікаць дык гэта сверб. Да кожнага іх трэку пасуе прыстаўка псеўда-. «Дразды» стаяць на сцяжыне г.зв. альтэрнатыўнай эстрады, як і «Крамбамбуля». Толькі ў праекту Вольскага неяк выходзіць падаць гэта зухавата-выпанчана, а ў «Драздоў» не сягае далей за нейкі сцёб (зноў жа з прыстаўкай псеўда-) ці стылізацыі. Суродзічаў «Драздоў» — гурт «Разбітае сэрца пацана» хоць сацыяльны кантэкст ратуе. Тут жа (пад)сэнсы малачытэльныя. Умеюць хлопцы дагадзіць і дзяўчатам («Ты далеко»), і дзеткам («Новы год — маскарад» з кан’юнктурным прысмакам) і нават дзембелям («Стучат колёса»). «Дразды» — нармальная фабрыка па вырабе пустышак. І не трэба тут выдаваць з сябе Міхалка з балалайкай. Дзіва было бачыць сярод удзельнікаў «Драздоў» гітарыстаў з «Уліcу» і WZ-orkiestra.

## Skrypa MX




Rebe Skrypa, DIY, 2008

А што ўжо казаць пра хард-рок інтэрпрэтацыю Hava Nagila.

Сольны альбом лідэра гурту zygimont VAZA Сяргея Скрыпнічэнкі, як развітанне з рэальнай выдавецкай прасторай. Пасля некалькіх спробаў выдання сваіх дыскаў на беларускіх лэйблах выканаўца прыйшоў да высновы, што гэта справа зусім немэтазгодная з камерцыйнага гледзішча ды вырашыў выкладаць усе свае новыя працы выключна ў інтэрнэт. Прыхільнікі «Каіну» ды «Камбінату» адразу пазнаюць фірмовую хард-блюзавую манеру ігры Скрыпы, але будзе і для іх здзіўленне. У кампазыцыі Gitana лідэр zygimont VAZA паўстае ледзь не Сантанам. А што ўжо казаць пра хард-рок інтэрпрэтацыю Hava Nagila. Скрыпа спачатку планаваў зрабіць альбом яўрэйскай музыкі, але потым узяў курс на разнастайнасць ды назапісваў усяго ўсякага, уключна з найлепшымі ўзорамі сусветнай музыкі. Аматары добрага інструменталу не расчаруюцца.

Пампаваць тут: http://www.zygvaza.net/dyskahrafija.html

**Сяргей Будкін**

# Правакацыйныя эксперыменты

**Ці не пара спыніць практыку аператыўных эксперыментаў, у выніку якіх людзі трапляюць у турму на 10 гадоў?**

Ці часта родныя асуджаных за цяжкія злачынствы адважваюцца на большае, чым напісанне апеляцыі? Бацькі 23-гадовага дызайнера, якога асудзілі на 10 гадоў калоніі за продаж наркотыкаў, пайшлі далей — яны ставяць пытанне пра слушнасць надзвычай жорсткіх пакаранняў для тых, хто аступіўся ўпершыню, пра аб'ектыўнасць судоў ды маральна-прававую абгрунтаванасць аператыўных эксперыментаў.

Арышт 23-гадовага дызайнера Арцёма стаўся поўнай нечаканасцю для ягоных родных і калегаў. Незадоўга да гэтага ўсё выглядала амаль ідэальна: прыгажуня-жонка і малое дзіця, шмат сяброў, добрая праца. Да ўсяго Арцём захапляўся сярэднявеччам, уваходзіў у адзін з рыцарскіх клубаў. І з працы, і з клубу бацькі атрымалі выдатныя характарыстыкі на свайго сына. Дызайнерская фірма, дзе той працаваў, апекавалася адной з лячэбных дзіцячых установаў. Хлопец афармляў там інтэр'ер, не адзін раз ладзіў творчыя вечары. З рыцарскім клубам аб'ездзіў паўкраіны.

У часе кароткіх сустрэч пасля арышту Арцём расказаў бацькам, што раз-пораз ужываў пасля працы лёгкія наркотыкі, каб зняць стрэс ад перанапружання, бо працаваў па 12—14 гадзінаў у суткі. Маўляў, такое — нярэдкасць у моладзевым асяродку, а тым больш у творчым. Перад арыштам малады дызайнер знайшоў іншую жанчыну. Тая мела судзімасць за наркотыкі, і праз знаёмства з ёй Арцём трапіў у поле зроку праваахоўных органаў. Пазней на судзе гэта пацвердзіў супрацоўнік следчай групы. Бацькоў асуджанага такі факт абурае. «Паводле закону ў той момант, як ім стала вядома пра нашага сына, у адносінах да яго мусілі прымяніць меры прафілактычнага характару», — кажа бацька Арцёма. На ягоную думку, міліцыянты фактычна падштурхнулі маладога чалавека на здзяйсненне больш цяжкага злачынства. Праз трэцюю асобу міліцыянты арганізавалі два закупы псіхатропных рэчываў. У выніку аператыўнага эксперыменту з удзелам сяброўкі-наркаманкі Арцём быў затрыманы за захоўванне і продаж наркатычных сродкаў. За гэта яму прысудзілі 10 гадоў калоніі. На волі засталася маладая жонка з маленькім сынам.

Судовы працэс у бацькоў дызайнера, для якіх усё было ўпершыню і якія не адмаўляюць віны сына, выклікаў безліч пытанняў. Да следчых, якія, на іх думку, мелі магчымасць папярэдзіць злачынства, але замест гэтага справакавалі чалавека на больш цяжкі з пункту гледжання Крымінальнага кодэксу ўчынак. Што праваахоўнікам важней: выкананне паказчыкаў раскрывальнасці ці чыйсьці ўратаваны лёс — губляюцца ў здагадках родныя Арцёма. Характэрны момант: на судзе супрацоўнік міліцыі прызнаў той факт, што арыштаваны назваў нумар тэлефону прадаўца з Расіі, у якога набыў наркотыкі, але следчы пры гэтым спаслаўся на адсутнасць сродкаў, неабходных для распрацоўкі гэтага кірунку справы. Ёсць пытанні і да суддзяў, якія, як падаецца бацькам, цалкам узялі ў гэтай справе бок следства, заплюшчваючы вочы на шэраг працэсуальных парушэнняў. Ёсць пытанні да праваахоўнай сістэмы ў цэлым, якая не робіць выключэння ні для злачынцаў са стажам, ні для тых, хто аступіўся ў першы раз, ды мае, зважаючы на характарыстыкі, неблагія шанцы выправіцца. «На волі Арцём, калі б яго своечасова спынілі ды абмежаваліся папярэджаннем, прынёс бы шмат болей карысці сваёй краіне, чым седзячы гадамі ў турме», — упэўненыя крэўныя зняволенага.

«Мы сутыкнуліся з сістэмай, якая разглядае чалавека вельмі схематычна, не заглыбляючыся ў дэталі і дробязі: аступіўся — пакараю! Пра выхаванне і перасцярогу ад неабдуманых учынкаў, здаецца, ніхто ўжо не дбае. Пакаленне маладых, якое завяло сабе звычку здымаць стрэс наркотыкамі, нікога не цікавіць, пакуль хтосьці з іх не дасць падставы камусьці з міліцыянтаў палепшыць паказчыкі ды прычапіць на пагоны чарговую зорачку», — дзеляцца ўражаннямі ад сутыкнення з беларускай Фемідай бацькі Арцёма.

Звярнуцца ў прэсу іх падштурхнуў леташні артыкул у «НН» «Маргарыта Царан на свабодзе». У ім вялося пра студэнтку Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэту, якую ў выніку следчага эксперыменту асудзілі на чатыры гады пазбаўлення волі.



Маргарыту прызналі вінаватай у незаконным набыцці з мэтаю продажу наркатычнага сродку. Пазней, пасля ўмяшальніцтва тагачаснага генпракурора Міклашэвіча, які назваў дзеянні гродзенскіх міліцыянтаў амаральнымі і злачыннымі, справу перагледзеў абласны суд, і дзяўчыне змякчылі пакаранне. Бацькі асуджанага дызайнера напісалі ліст цяперашняму генпракурору Рыгору Васілевічу, а таксама дэпутатам парламенту. Як вядома, шэраг дэпутатаў мінулага склікання выступалі за поўную забарону аператыўных эксперыментаў як метаду працы следчых органаў. У адпаведны закон была ўнесеная папраўка, якая забараняла правядзенне аператыўных эксперыментаў. Але той закон з папраўкай так і не быў прыняты. Неўзабаве прыйшоў адказ з парламенту, у якім гаворыцца, што «вырашэнне ўзнятага Вамі пытання адносіцца да выключнай кампетэнцыі органаў суду і пракуратуры, якія ў сваёй дзейнасці незалежныя і падпарадкоўваюцца толькі закону».

Напрыканцы лістапада кіраўнік МУС Уладзімір Навумаў заявіў, што адмаўляцца ад аператыўных эксперыментаў, калі справа датычыць цяжкіх злачынстваў, не выпадае. Генпракуратура, якая раней выказвала занепакоенасць з нагоды вялікай колькасці скаргаў ад ахвяраў такіх эксперыментаў, таксама выступае за захаванне такой методыкі працы следчых, але папярэджвае пра незаконнасць выкарыстання яго ў якасці правакацыі.

Статыстыка тым часам сведчыць пра несупынны рост злачынстваў, звязаных з ужываннем і распаўсюдам наркотыкаў. У мінулым годзе было выяўлена каля 4,5 тысяч такіх злачынстваў, з якіх 40% — злачынствы, звязаныя з распаўсюдам наркотыкаў. Штогод колькасць афіцыйна зарэгістраваных наркаманаў павялічваецца ў сярэднім на 800 чалавек. У той жа час колькасць выяўленых злачынстваў, звязаных з незаконным зваротам наркотыкаў, стала скарачаецца. Ці не таму следчыя органы не спяшаюцца адмаўляцца ад інстытуту аператыўных эксперыментаў, якія дазваляюць збольшага палепшыць сумную статыстыку? Такія пытанні непазбежна з'яўляюцца ў тых, хто ў выніку такіх эксперыментаў трапляе за краты, а таксама ў іх родных.

**Сямён Печанко**

**Афіцыйнае меркаванне**

Міністр унутраных справаў Уладзімір Навумаў: Правядзенне следчых эксперыментаў як метад працы неабходна захаваць, бо ён надзвычай неабходны для раскрыцця найбольш цяжкіх злачынстваў — хабарніцтва ды гандлю наркотыкамі.

# Крывавыя здарэнні ў канцы 2008-га

**Чатыры трупы**

Страшная аварыя адбылася 5 студзеня на аўтадарозе Брэст—Мінск каля вёскі Лесіна, што пад Баранавічамі.

27-гадовая жыхарка Масквы не справілася з кіраваннем «Форда-Фокуса», выехала на сустрэчную паласу і сутыкнулася з «Опелем-Сігнум», якім кіраваў 24-гадовы хлопец з Белаазёрску. Вадзіцелька «Форда» і яе пасажырка з-пад Брэста, а таксама 48-гадовы пасажыр «Опеля» загінулі на месцы. Пасля ў бальніцы памёр і кіроўца «Опеля».

**Замест Раства — пахаванне**

Тры чалавекі загінулі ў выніку ДТЗ у Слонімскім раёне. Аварыя адбылася днём 24 снежня каля вёскі Сенькаўшчына. 51-гадовы жыхар Ляхавіцкага раёну, кіруючы аўтамабілем «Аўдзі», выехаў на паласу сустрэчнага руху. А насустрач ехаў грузавік «Мерседэс».

Кіроўца «Аўдзі» і два пасажыры, 39-ці і 54-х гадоў, загінулі на месцы. Кіроўца «Мерседэсу», 28-гадовы дырэктар адной з фірм Жодзіна, знаходзіцца ў бальніцы.

**Тры чалавекі насмерць**

Тры чалавекі загінулі ў аварыі 23 снежня ў Полацкім раёне.

Каля вёскі Рудня «Фальксваген» выехаў на паласу сустрэчнага руху і сутыкнуўся з аўтобусам «Мерседэс». У выніку вадзіцелька — 30-гадовая жыхарка Мёраў — і пасажыры, 43-гадовы жыхар Мёраў і 39-гадовы жыхар вёскі Новы Пагост, загінулі. Спяшаюцца, абганяюць...

**Нагледзеліся тэлебачання**

У Мінску жорстка збілі студэнта-кітайца. Здарылася гэта днём у студэнцкім гарадку БДУ. Студэнт радыёфізікі БДУ ішоў на рэпетыцыю. У адной руцэ ён нёс аўдыёкалонку, у другой — электрагітару. Да яго падышоў малады чалавек і пачаў збіваць. Праз некалькі секунд падключыўся яшчэ адзін маладзён. Удвох яны павалілі студэнта на зямлю, жорстка яго збілі, забралі рэчы.

У цяжкім стане Сю Сяалея даставілі ў 2-ю клінічную бальніцу. Дактары зафіксавалі ў яго шматлікія траўмы галавы.

Падазраваныя ў разбойным нападзе двое навучэнцаў ПТВ віны не адмаўляюць. Андрэй, падазраваны ў разбоі: «Я ішоў. Мне падалося, што ён на мяне не так паглядзеў. Гэта кітаец. Тут падышоў мой сябра Стас».

За бойку маладзёнам пагражае да 15 гадоў пазбаўлення волі.

**МБ; інф. Poczobut.livejournal.com, БелаПАН, ont.by**

# Курасоўшчына — тэрыторыя, свабодная ад п'янства

**Жыхары сталічнага мікрараёну падалі ў Мінгарвыканкам заяўку на правядзенне 10 студзеня антыалкагольнай дэманстрацыі.**

Падставай для гэтага сталі некалькі няшчасных выпадкаў, што здарыліся ў мікрараёне з віны п'яных грамадзян, а таксама абвяшчэнне ўрадам пра павелічэнне вытворчасці спіртных напояў у 2009 г.

Таму на 10 студзеня (субота) у Курасоўшчыне плануецца правесці мітынг, а потым шэсце да цэнтру.

Дакладны маршрут пакуль не паведамляецца, паколькі не ўзгоднены з Мінгарвыканкамам. Таксама плануецца перадаць у гэты дзень зварот у канцылярыю прэм'ер-міністра (субота будзе працоўным днём).

Арганізатары акцыі падкрэсліваюць, што складана вырашыць праблему п'янства ў адным раёне, калі яна не будзе вырашаная па ўсёй краіне, і прапануюць усім зацікаўленым асобам узяць удзел у абмеркаванні спосабаў вырашэння праблемы п'янства. Прапановы просяць дасылаць на электронны адрас respublikabelarus@biz.by.

Магчыма, рэзюмуюць аўтары ініцыятывы, у краіне ёсць сілы, зацікаўленыя ў павелічэнні спажывання спіртнога жыхарамі Беларусі. Але разам мы выратуем Беларусь ад чумы.

*Леанід Скарабагаты*

## КАНЦЭРТЫ

**Дудары ў Глыбокім**

Канцэрт дударскай музыкі і спеваў адбудзецца **11 студзеня а 15.00 у Глыбоцкім гарадскім цэнтры культуры (Леніна, 40)**. Грае гурт **Essa** (Тодар Кашкурэвіч (дуда), **Дзяніс Сухі** (дуда, скрыпка), **Вольга Дзядовік** (спеў), **Святлана Клепікава** (спеў)). Прагучаць калядныя спевы і гістарычныя балады. Уваход вольны.




**Garadzkija ў Гродна, ў «Парламенце»**

**14 студзеня ў Гродна ў рэстаране «Парламент» гатэлю «Гродна»** ў межах кампаніі «Будзьма!» адбудзецца вялікі канцэрт гурту Garadzkija! Разам з імі выступяць перэможцы «Басовішча» гурт **Tlusta Lusta**, а таксама **Minerva**, **Pet Nihil** і **«Твой Горад». Пачатак а 18.00**

**Тыдзень беларускай фрык-авангард музыкі ў Маскве**

Удзельнікі фестывалю актуальнай беларускай музыкі «Можно!!!» (8–14 студзеня): **PortMone** (акустычны эмбіент, Мінск), **«Касіяпея»** (касмічны сінт-поп, Мінск), **нО-сОрОгОв** (бард-кор, Мінск).

## ВЫСТАВЫ

**Выстава ў гонар Васіля Быкава**

**9 студзеня кампанія «Будзьма!» запрашае на адкрыццё выставы, прысвечанай народнаму пісьменніку Беларусі Васілю Быкаву,** якая адбудзецца ў Віцебскай гарадской карціннай галерэі Беларускага саюзу мастакоў. Выстава арганізаваная сябрамі суполкі «Пагоня» разам з культурна-асветніцкім цэнтрам імя Язэпа Драздовіча. У экспазіцыі прадстаўленыя творы Міколы Купавы, Аляксея Марачкіна, Ігара Марачкіна, Яўгена Шатохіна, Віктара Крука, а таксама маладых мастакоў-удзельнікаў мастацкага пленэру, што адбыўся летам 2008 году ў Бычках, на радзіме Васіля Быкава.

**«Запаветная краіна» Рэрыхаў у Мінску**

**Выстава мастацкіх твораў Мікалая і Святаслава Рэрыхаў** працуе да 14 студзеня ў памяшканні Музею Вялікай айчыннай вайны ў Мінску (Кастрычніцкі пляц).

**Іспанская мазаіка**

**У Музеі гісторыі і культуры Беларусі да 20 студзеня** працуе фотавыстава «Іспанская мазаіка», на якой прадстаўленыя творы майстра іспанскай пейзажнай фатаграфіі сярэдзіны XIX стагоддзя Чарлза Кліфарда, выкананыя фатографам ў 1852—1863 гг.

**Калядны жывапісны кірмаш**

**У галерэі «Ласандр-арт» (Раманаўская Слабада, 24) да 15 студзеня** працуе «Калядны жывапісны кірмаш». У экспазіцыі — творы сучасных беларускіх мастакоў Ігара і Алены Бархатковых, Валянціна Губарава, Сяргея Рымашэўскага, Уладзіміра Канцэдайлава, Дзмітрыя Сурыновіча, Барыса Самілетава, Аляксандра Дзямідава.

**Patria o muerta! Venceremos**

**У Музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны да 31 студзеня** працуе выстава, прысвечаная 65-й гадавіне перамогі Кубінскай рэвалюцыі «Patria o muerta! Venceremos».

**Калядная зорка**

**У мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» (пл.Кастрычніцкая, 1) да 17 студзеня** працуе выстава «Калядная зорка». Такі зімовы падарунак для наведнікаў выставы падрыхтавалі студэнты і выпускнікі Універсітэту культуры і мастацтваў, а таксама Педагагічнага універсітэту.

**Шатэрнік у Нью-Йорку**

**18 студзеня ў 12.30 у Беларускім музеі па адрасе 401 Atlantic Ave., Brooklyn, N.Y.** адбудзецца адкрыццё выставы «Сонцакрыж» і сустрэча з скульптарам і мастком Алесем Шатэрнікам, які, акрамя твораў выяўленчага мастацтва, прэзентуе выдадзеную ў Мінску сваю новую кнігу-альбом «Сонцакрыж». Альбом складаецца з трох частак: Форма, Колер, Слова. Як вызначае аўтар сваю творчасць: «Жывапіс — гэта дзвюхмерная прастора, скульптура — трохмерная, а паэтычнае Слова выходзіць па-за межы гэтых прастораў і набліжаецца да чацвертага вымярэння — Боскага Слова. «Напачатку было Слова...» Алесь Шатэрнік — сябар мастацкай суполкі «Пагоня», адзін з аўтараў «Звана Свабоды», а таксама помніка Тадэвушу Касцюшку ў амерыканскай амбасадзе ў Мінску. Экспазіцыя складаецца з 35 алейных карцінаў. Гэта ў асноўным краявіды роднай Бацькаўшчыны, архітэктура храмаў Беларусі. Запрашаем усіх на выставу. Для тых, хто жадае фінансава дапамагчы ў арганізацыі выставы, кантактуйце праз т.: 646-234 9240 ці дасылайце чэкі на адрас: Belarusan Museum 401 Atlantic Ave, Brooklyn

## ТЭАТРЫ

**Купалаўскі тэатр**

**9 (пт)** — «Івона, прынцэса Бургундская»
**10 (сб)** — «Сны аб Беларусі»
**11 (ндз), 12 (пн)** — «Чорная панна Нясвіжу»
**14 (ср), 15 (чц)** — «Пінская шляхта»
**16 (пт)** — «Таполевая завея»
**17 (сб)** — «Маэстра»
**18 (ндз)** — «Каханне ў стылі барока»
*ранішнія спектаклі*
**18 (ндз)** — «Прыгоды Заранкі і Янкі»
*малая сцэна*
**9 (пт)** — «Беларусь у фантастычных апавяданнях»
**16 (пт)** — «Маці»




# Ядзерны выбух замест прычоскі

8 студзеня ў 17.00 у мінскай галерэі «Акадэмія» (вул. Сурганава, 14) адчыніцца выстава «Майстэрня» мінскіх мастакоў Аляксея Хацкевіча і Аляксандра Некрашэвіча.

Аляксей Хацкевіч — удзельнік тэледуэту «Саша і Сірожа», працуе ў стылістыцы дэкаратыўна-абстрактнага рэалізму. На выставе сярод іншых будуць прадстаўленыя карціны з праектаў «Вяселле» (развадажанні на тэму шлюбу, шлюбнай вернасці) і «Карціны-коміксы» (спроба насыціць жывапіс літаратурай і развіць яго глыбінны сэнс).

Аляксандр Некрашэвіч працуе на стыку поп-арту з выяўленчымі каламбурамі. На выставе будуць у тым ліку прадстаўленыя карціны з яго аўтарскага праекту «Цюнінг» — мастацкія фантазіі-развагі на тэму ўзаемадзеяння тэхнаіндустрыйнага асяроддзя і чалавека, на тэму ўплыву ўвогуле сучаснай цывілізацыі на чалавека. Сярод іх: «Фотаробат» (паяднанне вобразаў чалавека і робата), «Багіня Афіна» (жаночы вобраз з ядзерным выбухам замест прычоскі).

Што іх яднае — Аляксей і Аляксандр разам вучыліся ў Беларускай акадэміі мастацтваў, а пасля многа гадоў працавалі ў адной майстэрні. Адсюль і назва выставы. «Майстэрня» працуе да 18 студзеня.

# Таццяна Беланогая ў Воршы

**10 студзеня** бард Таццяна Беланогая выступіць з сольным канцэртам у Воршы. Імпрэза адбудзецца ў **памяшканні Дому культуры сляпых**. Спявачка прэзентуе публіцы свой новы альбом і выканае ўжо вядомы кампазіцыі. **Распачнецца імпрэза а 17.00.**



## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# Населеная выспа

**Населеная выспа** (Обитаемый остров: фильм первый)
Расія, 2009, каляровы, 110 хв.
**Рэжысёр:** Фёдар Бандарчук
**Ролі выконваюць:** Фёдар Бандарчук, Гоша Куцэнка, Сяргей Гармаш, Ганна Міхалкова
**Жанр:** фантастыка паводле аднайменнага раману братоў Стругацкіх
**Адзнака:** 5,5 (з 10)

2157 год. Маскоўскі студэнт Максім трапляе на таталітарную планету Саракш. Былой імперыяй, што вядзе зацятыя войны з колішнімі правінцыямі, кіруюць Невядомыя Бацькі, якія маніпулююць насельніцтвам, апраменьваючы яго. Максім стане гвардзейцам, тэрарыстам, катаржнікам — і галоўным парушальнікам таталітарнага спакою…

«Населеная выспа» — экранізацыя дысідэнцка-фантастычнага твора братоў Стругацкіх, надрукаванага ў асацыятыўным 1968-м. Алігархічны рэжым Палітбюро, татальная мана, дзяржаўнае разлажэнне! Прататыпы — вось яны на экранах ТВ. Кніга Стругацкіх была бунтарскай. А фільм выйшаў па духу такім, як уся расійская тэлебачанне сёння: адлакіраваным.

Але ў беларускіх гледачоў самую жывую рэакцыю ў фільме выклікае тэлевізійная «Псіхапанарама».

**Андрэй Расінскі**

# Барыс Стругацкі: Дзяржаўную хлусню дараваць немагчыма

Урывак з гутаркі з аўтарам кнігі, паводле якой быў пастаўлены фільм «Населеная выспа».



**— Вам падабаецца тое, што адбываецца ў апошні час? Няма адчування, што СССР вяртаецца?**

— У мяне ёсць адчуванне (і цалкам пэўнае), што СССР вяртаецца. Адбываецца адзяржаўленне ўсяго і ўся. Улада бюракратыі (чытай — наменклатуры) вярнулася цалкам. Застой глядзіцца як непазбежнасць.

А самае страшнае — гэта падабаецца большасці. Замест таго каб прагнуць шчаслівай справядлівай краіны, яны ізноў хочуць вялікую дзяржаву. І нізавошта не жадаюць разумець, што гэтыя дзве сацыяльныя структуры прынцыпова несумяшчальныя.

**— У апошні час стала звычайнай справай настальгаваць па савецкай эпосе. Як чалавек, які шмат пажыў пры СССР, вы хаця б у нечым падзяляеце гэтую настальгію?**

— СССР быў імперыяй хлусні. Як і ўсялякая таталітарная дзяржава. Хлусню дараваць немагчыма. Татальную дзяржаўную хлусню — тым больш. Усе спробы давесці, што тое і тое, маўляў, пры Саветах было добра, жыва нагадваюць мне дасужыя гутаркі аб тым, якія выдатныя пры Гітлеру былі пабудаваныя аўтабаны.

**Паводле Maxim**

# «Белсат»: тэлепраграма на 9—18 студзеня
# «Белсат» — гэта незалежны беларускі спадарожнікавы тэлеканал




### 9 студзеня, пятніца

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выданне).

**18.10** «Мент», дэтэктыўны серыял, 9 серыя.

**19.10** Праект «Будучыня»: навуковы агляд тэлеканалу «Нямецкая хваля».

**19.35** Паштоўка з Вільні (праграма пра беларусаў Літвы).

**19.55** Канцэрт фестывалю Be Free, ч. 3 — 3 Ху4, IQ48.

**20.25** Рэпарцёр (інфармацыйная праграма).

**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўнае выданне).

**21.15** Госць «Белсату»: Юрка Станкевіч.

*Перадача пра надзённыя праблемы Беларусі. Юрка Станкевіч — выдатны дзеяч беларускай эміграцыі, сын Яна Станкевіча, разам з Яззэпам Арцюхом ён выдае адзіны часопіс пра Беларусь на англійскай мове — Belarusian Review.*

**21.30** «Дзённік ягонае жонкі» (Дневник его жены), маст. фільм, рэж. Аляксей Учыцель, 2000 г., Расія.

**23.15** «Пітбуль», серыял, 8 серыя.

**00.00** Аб'ектыў (навіны).

### 10 студзеня, субота

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выданне).

**18.10** Тыдзень з радыё «Свабода».

**18.40** «Лэсі» (Lassie), маст. фільм, рэж. Чарлз Стэрыдж (Charles Sturridge), 2005 г., ЗША.

*Напярэдадні II сусветнай вайны для жыхароў шахцёрскага мястэчка ў Йоркшыры, дзе прыпыніліся праца мясцовай шахты, надышлі цяжкія часы. Каб неяк выжыць, сям'я Караклоў вырашае прадаць свайго сабаку-колі Лэсі старому герцагу Радлінгу. Той адвозіць Лэсі ў свой шатландскі замак — за пяцьсот міляў ад Йоркшыру. Аднак сабака ўцякае дадому...*

**20.25** Падземка (беларускі хітпарад).

**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўнае выданне).

**21.15** Маю права (прававаяя праграма).

**21.30** Еўропа сёння: тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля».

**22.05** «Амерыканскі самурай» (American Samurai), маст. фільм, рэж. Сэм Фэрстэнберг, 1992 г., ЗША.

*Эндру Колінз у дзяцінстве разам з бацькамі стаў ахвяраю авіякатастрофы. Ён цудам выжыў і, застаўшыся сіратою, трапіў у сям'ю Настаўніка, які адкрыў яму таямніцы самурайскага мяча, што ўвабраў у сябе сілу продкаў...*

**23.30** «Таўкачыкі на Каляды», ч. 1.

**23.50** Бульбаны.

**00.00** Аб'ектыў (навіны).

### 11 студзеня, нядзеля

**18.00** Прэс-экспрэс (агляд друку).

**18.15** «Ранча», серыял, 8 серыя.

**19.10** Канцэрт фестывалю Be Free, ч. 4 — Ulis.

**19.50** «Нетрываласць. Адзін дзень у свеце Далай Ламы», дак. фільм, 2005 г., Італія.

*Фільм пра жыццё і светапогляд Далай Ламы. «Мы прыходзім на гэты свет, каб памерці. Ці гэта мае які сэнс? Так, бо самі акрэсліваем сэнс паміж нараджэннем і смерцю». Гэтыя словы Далай Ламы скразным лейтматывам праходзяць праз усю стужку...*

**21.00** Аб'ектыў (вынікі тыдня).

**21.20** Ток-шоу «Форум»: Адмена санкцыяў: за і супраць.

**22.10** «Без абязбольвання» (Bez znieczulenia), маст. фільм, рэж. Анджэй Вайда, 1978 г., Польшча.

*Адна з этапных працаў польскага кінарэжысёра Анджэя Вайды, залічаная да фільмаў эпохі «маральнага неспакою». Вядомы журналіст Ежы Міхалоўскі пасля вяртання з-за мяжы дазнаецца, што жонка вырашыла пакінуць яго. Разлад у сям'і суправаджаецца і праблемамі на працы: яго тэксты не маюць ранейшага поспеху, курс лекцыяў ва універсітэце спыняецца, дазволу на выезд за мяжу няма. Жыццё коціцца да самагубства... Балансуючы на грані публіцыстыкі, Вайда паказвае адмоўны бок сацыялізму, дзе пануюць ураўнілаўка, крывадушнасць і зайздрасць.*

**00.00** Аб'ектыў (вынікі тыдня).

### 12 студзеня, панядзелак

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выданне).

**18.10** «Ранча», серыял, 8 серыя.

**19.00** «Нетрываласць. Адзін дзень у свеце Далай Ламы» (Impermanence: Dalai Lama), дак. фільм, 2005 г., Італія.

**20.00** Канцэрт фестывалю Be Free, ч. 2 — Neuro Dubel.

**20.30** Тыдзень з радыё «Свабода».

**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўнае выданне).

**21.15** Хто ёсць кім?: Вольга Завадская.

*Вольга Завадская — маці зніклага без следу 7 ліпеня 2000 г. аператара расійскай тэлекампаніі ОРТ Змітра Завадскага. Афіцыйна справа аб ягоным знікненні лічыцца скончанаю, і па ёй некалькі асобаў атрымалі доўгатэрміновае турэмнае зняволенне. Аднак маці не верыць у тое, што пакаралі сапраўдных злачынцаў, бо не атрымала адказу на галоўныя для яе пытанні: як загінуў і дзе пахаваны яе сын?*

**21.30** «Без абязбольвання» (Bez znieczulenia), маст. фільм, рэж. Анджэй Вайда, 1978 г., Польшча.

**23.25** «Элі Макбіл», тэлесерыял: III сезон, 5 серыя.

**00.05** Аб'ектыў (навіны).

### 13 студзеня, аўторак

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выданне).

**18.10** «Элі Макбіл», тэлесерыял: III сезон, 5 серыя.

**18.55** Ток-шоу «Форум»: Адмена санкцыяў: за і супраць.

**19.45** «Рок-карона—2007», ч. 1.

**20.25** Рэпарцёр (інфармацыйная праграма).

**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўнае выданне).

**21.15** «Вызваленне», ч. 2, дак. фільм, рэж. Вольга Нікалайчык, 2008 г., Беларусь.

**21.50** «Чырвоны Каптурок», анімацыйная камедыя, рэж. Коры Эдвардс, Тод Эдвардс, 2005 г., ЗША.

*Аўтары прапануюць нечаканую версію вядомай з дзяцінства казкі. Чырвоны Каптурок — зусім не тая цнатлівая дзяўчынка, якую мы прызвычаіліся бачыць у экранізацыях класічнага сюжэту. Расследаваннем яе знікнення займаецца інспектар Жаба, які, збіраючы сведчанні, задае сабе пытанні: чаму Бабка жыве так далёка ад унучкі, хто скіраваў Чырвоны Каптурок праз гушчар, і чым насамрэч займаецца Воўк? Адказы — у вясёлай сямейнай камедыі.*

**23.10** «Элі Макбіл», тэлесерыял: III сезон, 6 серыя.

**23.50** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (гумарыстычная праграма).

**00.00** Аб'ектыў (навіны).

### 14 студзеня, серада

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выданне).

**18.10** «Элі Макбіл», тэлесерыял: III сезон, 6 серыя.

**18.55** Паштоўка з Вільні (праграма пра беларусаў Літвы).

**19.15** Праект «Будучыня»: навуковы агляд тэлеканалу «Нямецкая хваля».

**19.45** Маю права (прававаяя праграма).

**20.00** «Балада пра Мялешкі», дак. фільм, рэж. Юрый Каліна, 2005 г., Польшча.

**20.25** Кухня (музычная праграма).

**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўнае выданне).

**21.15** YoLife! (моладзевая праграма).

**21.35** «Вызваленне», ч. 1, дак. фільм, рэж. Вольга Нікалайчык, 2008 г., Беларусь.

**22.15** Госць «Белсату»: Юрка Станкевіч.

**22.30** Жаўтуха.

**23.00** «Мент», дэтэктыўны серыял, 10 серыя.

**00.00** Аб'ектыў (навіны).

### 15 студзеня, чацвер

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выданне).

**18.10** «Мент», дэтэктыўны серыял, 10 серыя.

**19.05** Канцэрт гурту «Фляўс і Кляйн» з Фестывалю беларускай культуры і мастацтва (Мінск, 2008).

**19.30** «У пошуку ідышу», дак. фільм, рэж. Юрый Хашчавацкі, 2008 г., Беларусь.

**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўнае выданне).

**21.15** Сальда.

**21.35** Інтэрнаўты выбіраюць (агляд Сеціва).

**22.30** На колах: аўтамабільны агляд тэлеканалу «Нямецкая хваля».

**23.00** «Мент», дэтэктыўны серыял, 11 серыя.

**23.50** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (гумарыстычная праграма).

**00.00** Аб'ектыў (навіны).

### 16 студзеня, пятніца

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выданне).

**18.10** «Мент», дэтэктыўны серыял, 11 серыя.

**19.05** Праект «Будучыня»: навуковы агляд тэлеканалу «Нямецкая хваля».

**19.35** «Гаспадар», рэпартаж, 2008 г., Польшча.

**20.05** Падземка (беларускі хітпарад).

**20.40** Беларусы ў Польшчы.

**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўнае выданне).

**21.15** Госць «Белсату»: перадача пра надзённыя праблемы Беларусі.

**21.35** «У Бога за пазухай» (U Pana Boga w ogrodku), камедыя, рэж. Яцэк Бромскі (Jacek Bromski), 1998 г., Польшча.

**23.10** «Пітбуль», серыял, 9 серыя.

**00.00** Аб'ектыў (навіны).

### 17 студзеня, субота

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выданне).

**18.10** Тыдзень з радыё «Свабода».

**18.45** «У пошуках шчасця» (In Search of Happiness), дак. фільм, 2007 г., Італія.

*Гісторыя габрэяў, высланых Сталіным на Далёкі Усход.*

**19.40** Бульбаны.

**19.50** На колах: аўтамабільны агляд тэлеканалу «Нямецкая хваля».

**20.25** Кружэлка (сусветная музыка).

**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўнае выданне).

**21.15** Віртуальная помпа (агляд Сеціва).

**21.30** Еўропа сёння: тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля».

**22.00** «Таксі-3» (Taxi 3), камедыя, рэж. Жэрар Краўчык, 2003 г., Францыя.

*У трэцяй частцы шалёных прыгодаў марсельскага таксіста Даніеля і ягонага сябра-паліцыянта Эмільена — пошукі банды святых Мікалаяў, якія рабуюць марсельскія банкі. Эміл ьен так заняты сваёй справаю, што нават не заўважае, што ягоная дзяўчына Пэтра чакае дзіця. Захапіўшыся пошукамі рабаўнікоў, Эміл ьен арыштоўвае свайго начальніка — камісара Жыбэра, прыняўшы яго за злачынцу, калі той наўмысна пераапрануўся ў строй Калядната Дзеда, каб незаўважна ўвайсці ў банду. Урэшце Эміл ьен пры дапамозе ўсё таго ж Даніеля знаходзіць сапраўдных рабаўнікоў, але сам трапляе да іх у палон. Даніель, нягледзячы на пратэсты ягонае нявесты Лілі, спяшаецца выратаваць сябра з бяды, выкарыстоўваючы свой талент неперамо жнага трасера...*

**23.30** «Таўкачыкі на Каляды», ч. 2.

**23.50** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (гумарыстычная праграма).

**00.00** Аб'ектыў (навіны).

### 18 студзеня, нядзеля

**18.00** Прэс-экспрэс (агляд друку).

**18.15** «Ранча», серыял, 9 серыя.

**19.05** Навагодні канцэрт «Снежны завулак».

**20.05** «Кветкі тут не растуць» (Flowers don't grow here), дак. фільм, рэж. Шыра Пінсан, 2007 г., Італія.

*Працэс пераўтварэнняў у краінах Усходняй Еўропы не быў лёгкім. Напрыклад, ва Украіне зарэгістравана каля мільёна беспрытульных дзяцей. Яны часта становяцца ахвярамі гандляроў наркотыкамі, пераходзяць у ранг злачынцаў і прастытутак. У фільме расказваецца гісторыя трох дзяцей, паказваецца, як яны намагаюцца пераадолець гэтую пошасць сучаснага грамадства.*

**21.00** Аб'ектыў (вынікі тыдня).

**21.20** Ток-шоу «Форум»: Бяздомныя — хто вінаваты?

**22.05** Жаўтуха.

**22.35** «Народжаныя для прытонаў» (Born into Brothels), дак. фільм, рэж. Зана Брыскі, 2004 г., ЗША.

*Фільм прысвечаны дзецям найбяднейшых кварталаў Калькуты, дзе пануе наркаманія і прастытуцыя. Амерыканка Зана вучыць дзяцей фотасправе, каб дапамагчы ім вырвацца з гэтага асяроддзя і знайсці дарогу ў жыццё.*

**00.00** Аб'ектыў (вынікі тыдня).

ЛЕВЫМ ВОКАМ



# Чужыя галасы

**Дэвальвацыя асабліва ўразіла, бо кіраўнік дзяржавы ў навагоднім выступе пра яе словам не абмовіўся. А што, калі гэта была дыверсія? Фельетон Лёліка Ушкіна.**

*28.12.08. Падпольная студыя радыкальнай апазіцыі.*

**Першы** (*у мікрафон, млява*)**:** Мы не дапусцім абвалу, хаосу і прарыву НАТО на лініі Сталіна...

**Другі** (*за рэжысёрскім пультам*)**:** Якая Лінія Сталіна?! Прыпыніць адсябяціну! Вас выбралі падчас сакрэтнага кастынгу не для гэтага.

**Першы** (*капрызна*)**:** Дзіўны ў вас кастынг — ці глядзіш тэлевізар, ці чытаеш дзяржаўныя газеты... Але мне не падабаецца тэкст! Давай лепей запішам: «У Новым годзе наш рубель зраўняецца з еўра, Захад прызнае поспех беларускай мадэлі, а ўсе насельнікі аграгарадкоў стануць мільянерамі».

**Другі:** Апошняе, дарэчы, рэальна. Толькі рублёвымі мільянерамі. Але абыдземся без асабістых ініцыятываў. Раз, два — паехалі!

**Першы:** «Мы не, мы не... забыў тэкст. А для чаго мы, дарэчы, яго пішам? Ды яшчэ такім голасам?

**Другі:** Зараз пабачыце (*уключае відэамагнітафон*).

На экране кіраўнік дзяржавы трымае прамову ля ўпрыгожанага гірляндамі пункту абмену валют. Ён кажа, паклаўшы руку на сэрца: «Як чэсны палітык я мушу вызнаць, што заўтра нас чакае абвал і хаос. Праз некалькі хвілін пачнецца год Быка, які прынясе нам дэвальвацыю рубля на 20%. Таму мая вам парада: дапівайце шампанскае, даядайце «Аліўе» і бяжыце ў банкаматы здымаць зайчыкі, каб перавесці іх ў валюту. І скупляйце ўсё па старых цэнах, пакуль магчыма. Здароўя, шчасця дарагія сябры! З Новым годам!».

**Першы:** Ну?

**Другі** (*злавесна рагоча*)**:** Мы выкралі гэты запіс на БТ. Зменім фон і гук і запусцім 31 снежня ў эфір. І тады ўжо ніхто не будзе верыць уладзе! Ясна?

**Першы:** Не

**Другі:** Што не?

**Першы:** Наконт дэвальвацыі. Ну, мы ж таго, як тут напісана: «Мы ніколі не зменім свайму прынцыпу — клопат аб чалавеку!»

**Другі:** Як вы не разумееце. Гэты тэкст — цалкам фальшывы. Ён напісаны, каб потым, калі прыйдзе дэвальвацыя, выклікаць у насельніцтва яшчэ большы шок.

**Першы:** Ды які ж тут фальш? Мяне не падманеш — я кожны дзень тэлевізар гляджу! Гэта ж усё праўда: «Мы ўступаем у Новы год з верай у свае сілы». А вы кажаце — дэвальвацыя.

**Другі:** Супер! А як наконт вось гэтых радкоў? Не выклікаюць сумневаў?

**Першы** (*упэўнена*)**:** Мы не дапусцім абвалу і хаосу!

**Другі:** Нарэшце! Цішыня ў студыі. Пішам гук. Раз-два-паехалі!



**30 снежня споўнілася 100 гадоў жыхарцы Гродна Алене Домуць. Нягледзячы на ўзрост, яна выдатна трымаецца і сама ня верыць, што разменяла другую сотню. За сто гадоў баба Алена ні разу не хварэла і дагэтуль можа без акуляраў увесці нітку ў іголку. Любімы занятак Алены Домуць – складанне пазлаў. Паводле prosto-free.livejournal.com**

## Стаўлю бульбу варыць...

**Анатоль Вярцінскі.**

«ААН абвясціла 2008 г. «Міжнародным годам бульбы… Беларусь уваходзіць у васьмёрку найбольш буйных вытворцаў бульбы ў свеце і займае першае месца па вытворчасці яе на душу насельніцтва».

*З газетнай публікацыі*

Гэта словы, з якіх можна песню тварыць:
«Дзе ты ходзіш? Чакаю. Стаўлю бульбу варыць…»
Словы тыя заўсёды казаліся ў час,
словы тыя гучалі тады якраз,
калі ты ступаў на жыццёвую гаць,
калі думаў, як быць і каго кахаць,
быў гатовы адчаем сябе марыць…
Чуўся голас тады: «Стаўлю бульбу варыць».
Словы тыя выводзілі на шлях.
Станавілася з імі святлей у вачах.
Беларускам не трэба, апроч гэтых слоў,
нагаворнага зелля, чараў—замоў.
Беларуска знае, чым мужчыну скарыць,
як да сэрца яго сцяжыну тарыць
ды на мове якой з ім гаварыць.
Проста кажа: «Я стаўлю ўжо бульбу варыць».
Іншым разам можа яшчэ паўтарыць:
«Не марудзь, не спазняйся!
Стаўлю бульбу варыць».

Увага! Пачынаючы ад наступнага нумару газета будзе выходзіць у сераду і з'яўляцца ў кіёсках ва ўсёй краіне ў серады ад ранку. Гэта зроблена для зручнасці чытачоў у рэгіёнах. Наступны нумар пытайцеся ў кіёсках і шукайце ў паштовых скрынях 14 студзеня ад рання.

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

Горад, ведама, сам не арэ і не сее, а есці і піць павінен; вось і купляе ён усё з вёскі. Значыць горад — гэта рынак, на каторым вёска прадае свае вырабы. Чым больш гарадоў і чым яны вялікшыя, тым лягчэй і карысней можа прадаць дабро сваё селянін (і мужык, і памешчык). З усяго тут напісанага відаць, што і жыццё вясковага чалавека залежыць ад таго, як жыве горад.

**«Наша Ніва». №1. 2009**

## ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

**Міколу В. з Белаазёрску.** Ліст пра выбары быў задаўнены. Надрукавалі б, каб атрымалі адразу пасля выбараў.

**УН і К з Мінску.** З вершамі трэба яшчэ працаваць. Ясней выражайце свае ідэі.

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ВІТАННІ

**Віншуем** Насту і Віталя Броўкаў з узяццем шлюбу. Пладзіцеся і памнажайцеся! Няхай Броўкаваму роду не будзе пераводу. Сябры

### БЕЛАРУСКАМОЎНЫ САДОК

**Шукаю бацькоў**, якія жадаюць з восені 2009 г. аддаць сваіх дзяцей 3–4 гадоў у беларускамоўны садок у мікрараёне Сухарава (Мінск). Арганізацыйныя (і кантрольныя) абавязкі бяру на сябе. Звязвацца: (029) 395–73–99 (Дар'я) або праз акаунты скайп і гмэйл — apalonik

### КНІГІ

**Расстраляная літаратура**. Творы беларускіх пісьменнікаў, загубленых карнымі органамі бальшавіцкай улады — 45-ы том кніжнай серыі праекту «Беларускі кнігазбор». Гэта своеасаблівая анталогія беларускай літаратуры, творы 66 пісьменнікаў, загубленых у 1920-я — 1950-я гады.

Прыватныя абвесткі ў «НН» (не больш за 15 словаў) можна падаць бясплатна. Дасылайце поштай (а/с 537, 220050, Мінск) ці праз e-mail (nn@nn.by) або размяшчайце на форуме сайту www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

**Наша Ніва**
незалежная газета

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф-рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
заснавальнік — Мясцовы фонд выдання газеты «Наша Ніва»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Мінск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Кошт свабодны. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №581 ад 14 сакавіка 2007 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, пр. Ракасоўскага, 102–71. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.

Наклад 6000. Газета выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 07.01.2009.
Замова № 65.
Рэдакцыйны адрас: Ракасоўскага, 102–71.

ISSN 1819-1611

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12